ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 27 (1561) | Аўторак, 4 красавіка 1961 года | Цана 4 кап.

НАСУСТРАЧ XXII З'ЕЗДУ КПСС

НА ПЕРАДАВЫЯ РУБЯЖЫ, РАБОТНІКІ КУЛЬТУРЫ!

31 сакавіка ў Мінску, у клубе імя Дзяржынскага, адбылася рэспубліканская нарада работнікаў культурна-асветных устаноў, кінафікацыі і пракату, сумесна з прадстаўнікамі саюзаў кампазітараў, мастакоў, пісьменнікаў, кінематаграфістаў.

З дакладам «Задачы культурна-асветных устаноў і кінафікацыі рэспублікі па выкананню рашэнняў студзеньскага Пленума ЦК КПСС і падрыхтоўцы дастойнай сустрэчы XXII з'езду КПСС» выступіў міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў.

СПРАВЫ ПАРТЫІ — СПРАВЫ НАРОДНЫЯ

Студзеньскі Пленум ЦК КПСС узняў да актыўнага творчага жыцця мільёны працаўнікоў горада і вёскі. Савецкія людзі ўспрынялі рашэнні Пленума аб далейшым крутым уздыме сельскай гаспадаркі як сваю кроўную, родную справу. Бо хто ж не хоча жыць лепш, хто не зацікаўлены ў тым, каб наша краіна мацнела з кожным днём.

І работнікі культуры рэспублікі — верныя і надзейныя памочнікі партыі — рушылі ў баявы паход за новыя рубяжы. Яны шырока прапагандуюць рашэнні Пленума, мабілізуюць працоўных на датэрміновае выкананне сямігодкі і дастойную сустрэчу XXII з'езду партыі. Паглядзіце, колькі сапраўды цікавых і карысных спраў робяць яны цяпер у клубах, бібліятэках, палацах культуры, музеях і кінатэатрах, на фермах і ў брыгадах калгасаў і саўгасаў, на прадпрыемствах. І кожны дзень нараджае новае, вартае самага шырокага пераймання.

Асноўным зместам сваёй работы работнікі клубаў, бібліятэк, кінамеханікі лічаць цяпер дапамогу калгасам і саўгасам ва ўздыме сельскай гаспадаркі.

— У нас стала традыцыяй, — гаворыць загадчык Лапіцкага сельскага клуба Асіповіцкага раёна тав. Цяцерын, — акрамя лекцый і дакладаў наладжваць вечары ўшанавання перадавікоў калгаснай вытворчасці. Цікава прайшоў тэматычны вечар «На фермы — працавітыя, ініцыятыўныя, настойлівыя», у якім прынялі ўдзел выпускнікі сярэдняй школы. Многія калгаснікі адгукнуліся на гэты заклік. А ў канцы года на ўрачыстым вечары былі падведзены вынікі работы маладых жывёлаводаў.

Лапіцкі сельскі клуб раз у два месяцы праводзіць Дзень жывёлаводаў. Нядаўна клуб разам з партыйнай арганізацыяй калгаса падвёў вынікі спаборніцтва працаўнікоў жывёлагадоўных ферм. Былі ўручаны вымпелы, прэміі, а над лепшай фермай высока ў небе загарэлася чырвоная зорка.

Ідучы насустрач XXII з'езду партыі, клуб, разам са шматлікім актывам, вырашыў узяць шэфства над кукурузаводчымі звенямі — дапамагчы ім вырасціць кукурузу на насенне, каб забяспечыць ім свой калгас.

Адзін за адным узнімаліся на трыбуну работнікі культуры, і кожны расказваў, які падарунак яны рыхтуюць з'езду роднай партыі, чым дапамагаюць працаўнікам калгаснай вёскі. Кінафікатары Івацэвіцкага раёна, напрыклад, за першы квартал выканалі чатырохмесячны план. Гадавы план яны абавязаліся выканаць да дня адкрыцця з'езду.

— Жыхары Пінска змагаюцца за горад высокапрадукцыйнай працы і камуністычнага быту, — гаворыць дырэктар гарадскога Дома культуры тав. Сакольскі. — І мы, работнікі культуры, дапамагаем пінчанам зрабіць родны горад горадам узорнага грамадскага парадку і высокай культуры.

— У сваёй рабоце, — гаворыць начальнік Гомельскага абласнога ўпраўлення культуры тав. Гладковіч, — мы яшчэ не даходзім да кожнага сельскага клуба, да кожнай бібліятэкі, не ведаем іх патрэб, не сочым за іх культурным ростам і вучобай. Каб павярнуцца тварам да работнікаў культуры калгаснай вёскі, мы вырашылі правесці ў красавіку семінар сельскіх клубных работнікаў у Рагачоўскім раёне.

У кожным раёне ёсць свае маякі сярод работнікаў культуры, і трэба нам так арганізаваць справу, каб яны асвятлялі шлях кожнаму бібліятэкару, кінамеханіку, работніку клубных устаноў. Не трымаць пад спудам іх каштоўны вопыт, а шырока прапагандаваць яго па радыё, на старонках газет і часопісаў, на семінарах, прысвячаць ім выпуск спецыяльных «маланак», брашур! Сваю аператыўнасць павінны праявіць тут у першую чаргу органы культуры, Рэспубліканскі метадычны кабінет культасветработы і метадычныя кабінеты абласных бібліятэк. Новаму, перадавому — зялёную вуліцу!

АКТЫВІСТЫ — АПОРА У РАБОЦЕ

Які б здольны ні быў работнік культуры, ніколі ён не зможа ўсё зрабіць у адзіночку. Ёсць жа добрыя прыказкі: «Што аднаму з цяжкасцю даецца, тое калектывам лёгка бярэцца», «Адна пчала многа мёду не наносіць». Значыць, трэба дзейнічаць калектывам, трэба настойліва шукаць актыў, вучыць яго працаваць.

Гут для работнікаў культуры адкрываецца шырокае поле дзейнасці. Толькі зрабі адзін крок і — табе насустрач узнімуцца сотні працягнутых рук. У нашай рэспубліцы працуюць дзесяткі тысяч настаўнікаў, спецыялістаў сельскай гаспадаркі, урачоў, інжынераў. Ды гэта такая сіла, умела накіроўваючы якую, можна зрабіць усе нашы асяродкі культуры сапраўднымі апорнымі пунктамі мясцовых партыйных арганізацый, любімымі месцамі адпачынку працаўнікоў горада і вёскі.

На ўсю рэспубліку вядомы выдатны пачын сельскай інтэлігенцыі вёскі Моталь Брэсцкай вобласці. У Пінску нарадзілася ініцыятыва стварэння хатніх бібліятэк. Нашы цудоўныя савецкія людзі бескарысліва, па закліку сэрца нясуць кнігу ў гушчу народных мас.

Сакратар ЦК ЛКСМБ тав. Жабіцкі, дырэктар Мінскага абласнога Дома народнай творчасці тав. Гусеў і многія іншыя прысвяцілі свае выступленні ўдзелу грамадскасці ў рабоце ўстаноў культуры.

У свой час камсамольская арганізацыя Магілёўскай вобласці выступіла ініцыятарам булаўніцтва клубаў метадам народнай будоўлі. З мясцовых матэрыялаў сіламі камсамольцаў і моладзі было пабудавана каля 300 клубаў. Гэта ж так хораша, таварышы! І нам трэба дамагацца, каб камсамольскі агеньчык ініцыятывы ніколі не гас, а разгараўся ў вялікае полымя.

— Цяпер камсамольскія арганізацыі разгарнулі вялікую работу па стварэнню школ грамадскіх прафесій, — гаворыць тав. Жабіцкі. — У рэспубліцы сёння працуе каля 800 такіх школ, у тым ліку ў Віцебскай вобласці — 181 школа, у Гродзенскай — 140, Брэсцкай — 116 школ і г. д., а ўсяго ў рэспубліцы авалодваюць грамадскімі прафесіямі масавікоў, кніганошаў, лектараў, дакладчыкаў, інструктараў па розных відах спорту 25 тысяч юнакоў і дзяўчат. Гэта якраз той надзейны рэзерв, абапіраючыся на які, можна значна палепшыць культурна-асветную работу.

УВАГА ПЫТАННЯМ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

У цэнтры ўвагі многіх прамоўцаў нарады былі пытанні эстэтычнага выхавання народа і перш за ўсё маладога пакалення. Старшыня Саюза кампазітараў Я. Цікоцкі адзначыў, што цяпер, як ніколі, узрасло імкненне моладзі да мастацтва і асабліва да музыкі.

Тав. Цікоцкі гаворыць далей аб тым, што ў рэспубліцы музычная асвета знаходзіцца фактычна ў веданні трох міністэрстваў—культуры, асветы і вышэйшай адукацыі. І таму, відаць, справа з выданнем педагагічнай літаратуры для агульнаадукацыйных і спецыяльных школ пастаўлена дрэнна. Трэба, каб выданнем гэтай літаратуры займаўся адзін хто-небудзь.

Далей тав. Цікоцкі расказвае пра мерапрыемствы, якія правядзе Саюз кампазітараў, ідучы насустрач XXII з'езду КПСС. Аб'яўлен конкурс на лепшую песню, прысвечаную партыі, народу. У кожнай вобласці будзе праведзен Дзень беларускай савецкай музыкі. У першы дзень гэтае свята музыкі будзе праходзіць у абласным цэнтры, а на другі дзень—у адным з раёнаў. Запланавана правесці «Музычную вясну»—агляд маладых талентаў. Саюз кампазітараў бярэ шэфства над мастацкай самадзейнасцю васьмі раёнаў рэспублікі. Будуць праводзіцца творчыя сустрэчы кампазітараў са слухачамі ўніверсітэтаў культуры рэспублікі. Ужо за тры месяцы гэтага года адбылося 45 выездаў—у Бабруйск, Горкі, Віцебск, Паставы, Бярозаўскую ДРЭС, Слуцк і іншыя раёны Беларусі. У музычных школах наладжваем конкурс на лепшае выкананне савецкіх твораў. Такія конкурсы адбыліся ўжо ў Мінску і Бабруйску. Кампазітары Алоўнікаў, Семяняка, Кузняцоў абавязаліся напісаць новыя творы для самадзейных калектываў.

Старшыня праўлення Беларускага тэатральнага таварыства Л. Александроўская расказала, як творчыя работнікі тэатраў рыхтуюцца да з'езду партыі, аб шэфстве вядомых майстроў сцэны рэспублікі і тэатральных калектываў над народнымі тэатрамі.

На нарадзе выказвалася нямала крытычных заўваг аб тым, што наша самадзейнасць і сёння адчувае вострыя недахопы у сучасным рэпертуары. Загадчык Лепельскага аддзела культуры тав. Хацько гаварыў пра тое, як цяжка склаці добры рэпертуар для агітбрыгад, што выступаюць перад працаўнікамі калгаснай вёскі. Выказвалася слушная прапанова, каб да XXII з'езду партыі самадзейныя калектывы падрыхтавалі канцэртную праграму на тэму «Партыя—наш рулявы». І кожная вобласць, кожны раён, кожны самадзейны калектыў будзе рыхтаваць гэты святочны канцэрт, шукаць арыгінальныя, свежыя фарбы, каб ён уславіў савецкага чалавека — будаўніка камуністычнага грамадства.

Кінарэжысёр студыі «Беларусьфільм» тав. Голуб і начальнік Гомельскага абласнога ўпраўлення культуры тав. Гладковіч звярнулі ўвагу прысутных на неабходнасць больш уважлівага і кваліфікаванага стаўлення да прапаганды лепшых твораў савецкага кінамастацтва, аддаючы ім перавагу на экранах рэспублікі. Ёсць у нас выпадкі, калі асобныя работнікі кінафікацыі захапляюцца слабымі ў ідэйных і мастацкіх адносінах замежнымі фільмамі. Гэтага нельга дапускаць.

Удзельнікі нарады аднадушна прынялі сацыялістычныя абавязацельствы работнікаў кінасеткі, кінапракату і культасветустаноў на 1961 г. У іх намечаны мерапрыемствы па ўзмацненню масава-палітычнай і культурна-асветнай работы ў гарадах і вёсках Беларусі. Удзельнікі нарады заклікалі ўсіх работнікаў культуры павысіць арганізацыйны ўзровень і ідэйны змест масава-палітычнай і культурна-асветнай работы, шырэй прапагандаваць матэрыялы студзеньскага Пленума ЦК КПСС. Вырашана ў кожнай культасветустанове стварыць па-мастацку аформленую наглядную агітацыю, выкарыстоўваючы для гэтага факты з жыцця. Сістэматычна праводзіць вечары пытанняў і адказаў, сустрэчы з перадавікамі вытворчасці, членамі брыгад і ўдарнікамі камуністычнай працы, стварыць у клубных установах кабінеты і куткі па прапагандзе перадавога вопыту ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. Усю масава-палітычную работу ва ўстановах культуры накіроўваць на паспяховае ажыццяўленне рашэнняў студзеньскага Пленума, на дастойную сустрэчу XXII з'езду КПСС.

У рабоце нарады прыняў удзел і выступіў з прамовай сакратар ЦК КПБ тав. Шаура В. Ф.

Едуць навасёлы

Вясна ідзе ў Цалінны край.

У гэтыя дні тысячы юнакоў і дзяўчат па камсамольскіх пуцёўках едуць асвойваць новыя землі. У райкомы, у абкомы і ЦК камсамола ідуць тысячы заяў ад выпускнікоў сярэдніх і вышэйшых спецыяльных навучальных устаноў.

«Наша рашэнне: у маі гэтага года, адразу пасля заканчэння вучылішча, ехаць у Цалінны край. Цяжкасцей не баімся — мы ўсе камсамольцы. Хочам XXII з'езд партыі сустрэць поспехамі на будоўлях Цаліннага краю»,—пішуць выпускнікі Маскоўскага будаўнічага вучылішча № 19.

«Камсамол навучыў нас пераадольваць цяжкасці,— заяўляюць у сваім пісьме студэнты шостага курса 2-га Маскоўскага медыцынскага інстытута.— Упэўнены, што апраўдаем давер'е камсамола, не страцім гонару інстытута і здолеем аддаць свае сілы нашай працы. Сярод нас — будучыя хірургі, педыятары, тэрапеўты, перад кожным вялікае поле дзейнасці».

Многія выпускнікі Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута па прыкладу маскоўскіх камсамольцаў вырашылі паехаць працаваць на цалінныя землі. Сярод іх (на здымку — злева направа) — заатэхнікі Аляксандр **Фяськоў** і Алег **Шаўчэнка**, аграномы Ганна **Сідлярэвіч** і Галіна **Падгурская**, заатэхнік Уладзімір **Ляшэўскі**.

Фота **М. Вільчынскага**.
Фотахроніка БЕЛТА.

КРЫНІЦА ТАЛЕНТАЎ

Выдатны пачын купалаўцаў, якія выступілі ў спектаклях Аршанскага і Ашмянскага народных тэатраў, сапраўды адкрывае шырокую дарогу да цеснай творчай садружнасці прафесіянальнага мастацтва з самадзейным.

Вядома, яшчэ рана гаварыць пра сціранне граняў паміж прафесіянальным і самадзейным тэатрамі. Аднак сам факт сумеснага выступлення праслаўленых майстроў і артыстаў-аматараў — больш чым відавочная адзнака паспяховага збліжэння двух патокаў савецкага тэатральнага мастацтва, збліжэння, якое ў будучым неміну ча прывядзе іх да зліцця ў адзіны паток небывалага і велічнага тэатра камуністычнага заўтра.

Рух народных тэатраў — не першы масавы тэатральны рух у нашай краіне. Мы памятаем і рабочыя тэатры Пралеткульта, якія бурна нараджаліся, і гарэзлівыя камсамольскія тэатральныя арганізацыі — Трамы. І тыя і другія з першых жа крокаў старанна адгароджваліся ад прафесіянальных тэатраў, часцей за ўсё проціпастаўляючы сябе ім. Праўда, на гэта былі прычыны: ужо вельмі вялікая была тады дыстанцыя паміж артыстамі прафесіянальнага тэатра і няўмелымі і мала адукаванымі рабочымі хлопцамі ці ў майстэрстве, так і ў агульнай культуры.

Калі ўжо ўспамінаць пра памылкі мінулага, каб не паўтараць іх зноў, дык будзем мець на ўвазе, што і сёння дачаснае і празмернае захапленне ледзь прыкметных поспехаў самадзейных тэатраў можа толькі пашкодзіць ім.

Толькі сур'ёзная дапамога, творчая патрабавальнасць, увага да ўсяго таленавітага, без угодніцкага захвалвання, патрэбна нашым народным тэатрам.

Дапамога можа быць самай разнастайнай. Тут і асабісты ўдзел у спектаклі, і глыбокая прафесіянальная размова пра спектакль з дэталёвым аналізам кожнай з акцёрскіх прац, і семінары, прысвечаныя падрабязнаму разгляду праблем майстэрства на матэрыяле спектакляў, якія ідуць у народных тэатрах і г. д.

Думаецца, кожны з нас, прафесіяналаў, пры сустрэчы з калектывам Народнага тэатра павінен выбраць той від дапамогі, у якім ён здольны прынесці больш за ўсё карысці. Вядома, найлепш выкарыстоўваць усе віды творчай дапамогі ў адзіным комплексе. Але нішто не здольна так зблізіць артыста-прафесіянала з самадзейнымі артыстамі, як іх сумеснае выступленне ў спектаклі.

Практыка паказвае, што эпізадычныя, кароткатэрміновыя паездкі-сустрэчы з народнымі тэатрамі мала эфектыўныя. Да таго ж напружанасць планаў абласнога тэатра не часта дазваляе акцёру або рэжысёру выбраць час для выезду ў Народны тэатр.

Калектыў Брэсцкага тэатра штогод бывае на гастролях у Пінску і мае магчымасць на працягу гастрольнай паездкі сістэматычна дапамагаць свайму падшэфнаму калектыву. Аднак не адразу былі знойдзены формы дапамогі. Трэба шчыра сказаць, што спачатку і дружба калектываў, і шэфства насілі толькі афіцыйны характар. Сумесны творчы семінар па пытаннях майстэрства акцёра з падрабязным разглядам асноўных праблем і ўзаемным абмеркаваннем работ абодвух тэатраў не толькі зблізіў калектывы, паклаў пачатак сапраўднай творчай сувязі, але і вельмі ўзбагаціў артыстаў нашых тэатраў. Цяпер многія артысты, рэжысёры, мастакі і іншыя работнікі Брэсцкага тэатра сталі ганаровымі членамі калектыву Пінскага народнага тэатра. Тады ж было выказана і пажаданне абменьвацца і выступленнямі асобных артыстаў у спектаклях тэатраў.

Аднак практычна гэта здавалася немагчымым, бо ў нашым рэпертуары не было агульных спектакляў. Нядаўна пінчане выпусцілі «Кухарку» Сафронава, якая даўно ўжо ідзе на сцэне нашага тэатра. Заслужаныя артысты БССР А. Асторына і Б. Уксусаў, артысты Н. Ганчарэнка, Л. Сторажава, С. Яўдошанка, С. Юркевіч, М. Балдоўскі — ўсе выканаўцы асноўных роляў у нашым спектаклі па п'есе А. Сафронава выказалі гарачае жаданне выступіць у спектаклі пінчан, следуючы прыкладу артыстаў Тэатра імя Янкі Купалы. Спадзяёмся і на нашай сцэне ўбачыць лепшых выканаўцаў пінскага спектакля.

Думаецца, мэтазгодна было б выступіць у спектаклі і другога якога тэатра ў пары са сваім асноўным партнёрам ці партнёркай. Гэтыя выступленні будуць суправаджацца абмеркаваннем у калектыве работ выканаўцаў абодвух тэатраў і звязаных з імі праблем майстэрства.

Пінскі тэатр пачынае працу над п'есай М. Заруднага «Мёртвы бог». Наш галоўны мастак А. Гзыла аформіць яго. Мы хочам прапанаваць пінчанам прызначыць на адну з роляў у новым спектаклі каго-небудзь з нашых артыстаў. Працуючы над роллю і выязджаючы час ад часу на рэпетыцыі ў Пінск, ён здолее пасля выпуску спектакля выступіць у ім.

Купалаўцы праклалі добры шлях, трэба яго прадоўжыць.

Брэсцкі тэатр сістэматычна папаўняе трупу таленавітай моладдзю з самадзейнасці. Вырас і ўдасканаліў сваё майстэрства на нашай сцэне былы токар Юрый Істомін, які прыйшоў з самадзейнасці. Валянціна Свінцова папрацавала ў нас год у дапаможным складзе і рэкамендавана намі да паступлення ў Мінскі тэатральна-мастацкі інстытут, дзе яна цяпер вучыцца. У гэтым сезоне мы прыцягнулі ў трупу з мясцовай самадзейнасці Тацяну Цярохіну і Анатоля Маліноўскага, з Украіны да нас прыехала Мая Сакалова. Яны паспяхова ўжо сыгралі рад роляў. Для ўдзелу ў народных сцэнах мы запрашаем лепшых удзельнікаў мясцовай самадзейнасці. Але наўрад ці могуць абласныя тэатры пры крайняй напружанасці іх планаў аддаць дастаткова ўвагі студыям. Так што да прапановы аб стварэнні пры абласных тэатрах студый трэба, на маю думку, ставіцца асцярожна.

Тым не менш мы шукаем і будзем шукаць у найбагацейшых крыніцах самадзейнага мастацтва каштоўныя крупінкі народных талентаў.

Ю. АРЫНЯНСКІ,
заслужаны дзеяч мастацтва БССР, галоўны рэжысёр Тэатра імя ЛКСМБ.
Брэст.

ЖЫЦЦЁ ПАТРАБУЕ

А. ВАРАНЕЦКІ,
старшыня калгаса «Гвардыя» Берастовіцкага раёна Гродзенскай вобласці.

Клопатамі пра людзей свайго калгаса жыве партыйная арганізацыя сельгасарцелі «Гвардыя» Берастовіцкага раёна Гродзенскай вобласці. З кожным годам умацоўваецца грамадская гаспадарка арцелі. Летась калгаснікі вырасцілі да 335 цэнтнераў цукровых буракоў з гектара, а на плошчы 240 га атрымалі па 850 цэнтнераў кукурузнага сіласу з кожнага гектара. Мае цяпер 610 кароў. У мінулым годзе арцель атрымала звыш пяці мільёнаў рублёў прыбытку.

А сёлета мы набіраем яшчэ большы разгон. Крылы нам даў студзеньскі Пленум ЦК КПСС. Вялікія спадзяванні ўскладаем на трэці год сямігодкі. Павысяцца ўраджаі, больш прадуктаў ад жывёлагадоўлі атрымаем мы сёлета. Нашы калгаснікі працуюць з сапраўдным энтузіязмам.

Шырокім фронтам разгарнулася ў калгасе будаўніцтва не толькі гаспадарчых, але і культурных аб'ектаў. Летась калгаснікі ўрачыста адзначылі навасёлле ў вялікім новым клубе з цэнтральным ацяпленнем. Глядзельная зала яго разлічана на 320 месц, а на сцэне можа выступаць любы сталічны тэатр. Ёсць яшчэ прасторнае фае і 11 пакояў для працы гурткоў.

1 Мая адкрыем яшчэ два міжбрыгадныя клубы. Калгас пабудаваў тры лазні, школу і дзве майстэрні для вучняў. А каб людзі не жылі ў старых хацінах, для сваіх лепшых працаўнікоў калгас пабудаваў 71 дом.

Прыязджайце да нас і паглядзіце, як выглядае сёння наша вёска Рамітніцы. У нас не ўбачыш цяпер такога, каб кожны двор быў абгароджан па-свойму. І веснічкі, і агароды, і вароты аднолькавыя ва ўсёй вёсцы. Адразу стала прыгажэй. Праведзен ужо водаправод, устанаўліваюцца калонкі, па жаданню калгаснікаў вада будзе падведзена ў кожны дом.

А яшчэ калгас будуе яслі і радзільны дом. Значыць, дбае пра сваю будучыню, пра тое, каб дзеці раслі здаровыя, каб даць магчымасць кожнай жанчыне ўдзельнічаць у грамадскай карыснай працы.

Размах нашых планаў вялікі. Партыйная арганізацыя і праўленне арцелі шмат увагі аддаюць добраўпарадкаванню вёскі. У нашым генеральным плане — будаўніцтва цэлага аграгарадка. У ім дамы ўсе адзін пад адзін — цагляныя, вакол іх вырастуць сады, разаб'ём алеі, на вуліцах тратуары паробім. Ну чым будзе не горад! Сёлета пабудуем 21 такі дом. Будаўнічыя работы разгортваюцца поўным ходам.

Калі б партыя і ўрад не клапаціліся аб калгасным сялянстве, аб уздыме сельскай гаспадаркі, хіба здолелі б мы ажыццявіць такія планы перабудовы свайго жыцця. Дзякуй ёй, родная, за клопаты, за ўвагу да кожнага працаўніка вёскі.

Некалі паны гаварылі: селяніну патрэбна толькі чарка і скварка. Пра іншае ён ніколі не марыў. Цяпер жа багацце прыйшло ў кожны дом, у кожную калгасную сям'ю. З'явіліся новыя патрабаванні. Сем год працуе свінаром у калгасе Тадэуш Лісоўскі. Добра жыве чалавек. У сярэднім заробляе 150 рублёў у месяц. Ёсць у яго і хлеб і да хлеба. Іншыя клопаты цяпер у чалавека. Неяк зайшоў ён у праўленне і кажа:

— Ведаеш, старшыня, ёсць у мяне дзеці. Трэба іх вучыць музыцы. Хачу ім купіць баян. Можна было б набыць і піяніна. Дапамажы. Няхай дзеткі былых панскіх парабкаў будуць музыкантамі, няхай славяць у песнях наша савецкае жыццё.

Вось што ён мне сказаў. І добра сказаў. Кінуліся мы туды-сюды: у раён, вобласць —і нічога не выйшла. Аказваецца, ні за якія грошы не знойдзеш выкладчыка музыкі, хоць праўленне калгаса згодна было плаціць яму колькі трэба.

Так што не адзіным хлебам сыты савецкі чалавек. Яму патрэбна цяпер сапраўдная культура, ён цягнецца да яе ўсёй сваёй шчырай душой, як расліна да сонца. А што мы можам зрабіць? Як заахвоціць гэты цудоўны ўзлёт душы савецкага чалавека, старанная працаўніка на ніве калгаснай.

У нашым клубе працуе мастацкая самадзейнасць. Слава і хвала нашым энтузіястам — моладзі. Але ж мы клуб будавалі не толькі для сваіх аматараў. Нам жа абяцалі, што ў новы Палац культуры будуць прыязджаць артысты з Мінска, Гродна і іншых гарадоў рэспублікі, але пакуль што абяцанкі засталіся абяцанкамі.

Калгаснікі хочуць, каб да іх рэгулярна прыязджалі прафесіянальныя калектывы і брыгады. Калгаснікі нашы жывуць добра. Гарантуем добрыя зборы, аншлаг будзе, не сумнявайцеся.

У нашай арцелі працуюць чатыры стацыянарныя кінаўстаноўкі. Калгаснікі ахвотна наведваюць кіно, а праўленне наладжвае бясплатныя сеансы сельскагаспадарчых фільмаў. План кінаабслугоўвання ў калгасе заўсёды перавыконваецца.

У рабоце культасветустаноў прымае актыўны ўдзел сельская інтэлігенцыя. Вялікае дзякуй ёй за гэта. Дапамагаюць нам паспяхова выконваць свае планы «Баявыя лісткі» ў брыгадах і на фермах, светавая і насценная газеты і сатырычная газета «Вандроўны Кракадзіл». Светавая газета паказвае добрых, сумленных людзей, якія аддаюць усе сілы калгаснай вытворчасці, крытыкуе гультаёў, дармаедаў.

На вопыце я пераканаўся, што грамадскае ўшчуванне дзейнічае на людзей больш, чым розныя адміністрацыйныя спагнанні. Прыгадваецца такі выпадак. Аднойчы дзве свінаркі ўкралі з фермы два мяхі мукі. Даведаліся пра гэта ў праўленні. Вырашылі на дапамогу заклікаць наш «Вандроўны Кракадзіл». Размаляваілі ў ім як след гэтых злодзеяў, і пайшоў вандраваць наш «Кракадзіл» з брыгады ў брыгаду, з фермы на ферму. Людзі ходзяць, смяюцца, кпяць. А што можа быць мацней за смех. Прасілі пасля гэтыя свінаркі хутчэй зняць гэты выпуск: «А то соромна людзям на вочы паказацца»,— гаварылі яны.

Мне хочацца звярнуць увагу і яшчэ на адно пытанне. Трэба нам шырэй разгортваць калгасную мастацкую самадзейнасць. Гэта надзейны шлях арганізацыі сапраўды культурнага адпачынку працаўнікоў вёскі. Цэнтральнай фігурай з'яўляецца баяніст, ён жа і масавіком павінен быць. А як у нас звычайна бывае? Баяніст, закончыўшы аднагадовыя курсы, сяк-так навучыцца падыгрываць харыстам, ды яшчэ сыграе на танцавальным вечары. Але ж гэтага мала. Трэба, каб калгасны баяніст мог вучыць дзяцей музыцы, трэба, каб ён быў і масавіком-заводатарам розных цікавых спраў. На маю думку, варта ўнесці змены ў сістэму падрыхтоўкі калгасных баяністаў.

Вельмі хацелася нам займець свой аркестр духавых інструментаў. І праўленне калгаса горача падтрымала гэтую прапанову. Ужо хацелі было кінуцца на пошукі. Але справа заняпала. Купіць інструменты можна. Толькі будуць яны ляжаць і псавацца. Ніхто ж не ўмее на іх іграць, ахвотнікаў вучыцца хоць адбаўляй. Аркестра не маем з-за адсутнасці кіраўніка.

Добрую ініцыятыву праявіла наша бібліятэкарка Ніна Гуліцкая. Будучы на курсах у Мінску, яна адначасова вучылася на курсах крою і шыцця. Прыехаўшы ў калгас, арганізавала вакол сябе дзяўчат. Маладыя калгаснікі з захапленнем пачалі вучыцца шыць. Праўленне калгаса пайшло ім насустрач: купілі швейныя машыны, розныя ніткі — справа пайшла на лад. Цяпер многія нашы дзяўчаты самі шыюць сабе прыгожае моднае адзенне.

Не так даўно спраўлялі мы камсамольскае вяселле. Багатае і радаснае было яно. Сталы ламаліся ад вяндліны, каўбас, рознага мяса. Але ніхто не здолеў як след «накрыць» святочны стол, упрыгожыць яго. І гэта навяло нас на думку стварыць у калгасе для нашых дзяўчат і жанчын гурток дамаводства. Праўленне падтрымала гэтую прапанову. Звярнуліся мы за дапамогаю да настаўнікаў. Яны ж маюць вышэйшую адукацыю. І ніхто з іх не ўзяўся кіраваць гуртком дамаводства.

Мне здаецца, установы, якія рыхтуюць работнікаў культуры, абавязаны навучаць сваіх выхаванцаў і дамаводству, і крою, і шыццю.

Непазнавальна мяняецца аблічча калгаснай вёскі. Яна добраўпарадкоўваецца, прыгажэе, а ў людзей яе растуць усё новыя і новыя культурныя запатрабаванні. І гэта заканамерна. Мы ж у камунізм ідзём.

Гомель—Мазыр

Мацнеюць сувязі Мазырскага народнага тэатра з яго шэфам — Гомельскім абласным драмтэатрам. У час падрыхтоўкі спектакля «Юнацтва бацькоў» абласны тэатр памог аформіць яго.

Рашэннем абласнога ўпраўлення культуры да Мазырскага народнага тэатра для пастаянной дапамогі прымацаваны рэжысёр Гомельскага драмтэатра Я. Батурын і заслужаны артыст рэспублікі М. Цурбакоў, якія часта бываюць у мазыран.

Я. Батурын нядаўна правёў заняткі з удзельнікамі Народнага тэатра па тэхніцы акцёрскага майстэрства, па тэхніцы мовы і дыхання, падзяліўся думкамі аб рабоце над спектаклем і ролямі.

Днямі ў Народны тэатр прыехаў заслужаны артыст БССР М. Цурбакоў і прыняў удзел у абмеркаванні роляў п'есы «Лявоніха на арбіце», затым правёў рэпетыцыю гэтай п'есы.

Т. ІВАНОЎ.

ІМ ПРЫСВОЕНЫ ГАНАРОВЫЯ ЗВАННІ

Праца заслужанага дзеяча мастацтва БССР Васіля Фядосавіча **Сербіна**, вось ужо больш дзесяці год звязана з ансамблем песні і танца ВВА. З'яўляючыся яго нязменным мастацкім кіраўніком, ён падрыхтаваў з ансамблем, апрача шматлікіх звычайных канцэртных нумароў, рад тэматычных вакальна-харэаграфічных сюіт і кампазіцый. Адна з такіх кампазіцый была прысвечана 40-годдзю Савецкай Беларусі.

Зараз артысты ансамбля развучваюць новую тэматычную праграму, прысвечаную 20-годдзю абароны Брэсцкай крэпасці.

Галоўны дырыжор Беларускай ваеннай акругі, заслужаны артыст рэспублікі Уладзімір Якаўлевіч **Мартынаў** многа працы і энергіі аддае выхаванню і навучанню ваенных музыкантаў, папулярызацыі твораў кампазітараў-класікаў, савецкіх, у тым ліку беларускіх аўтараў.

Выкананне пад яго кіраўніцтвам урачыстай увертюры Чайкоўскага «1812 год» у заключным канцэрце конкурсу духавых аркестраў акругі было буйным творчым поспехам таленавітага дырыжора.

Аляксандр Філіпавіч **Майзлер**, якому прысвоена званне заслужанага артыста БССР, працуе старшым дырыжорам узорнага аркестра ВВА. Пад яго кіраўніцтвам аркестр ВВА ў 1960 г. на Усесаюзным конкурсе ваенных аркестраў у Маскве заняў трэцяе прызавое месца.

А. Ф. Майзлер сам піша творы для духавых аркестраў і музыкантаў-выканаўцаў.

Заслужаная артыстка БССР **Гамуліна-Цурбакова** Людміла Аляксандраўна працуе на беларускай сцэне амаль чвэрць стагоддзя.

Асаблівага поспеху артыстка дасягнула ў спектаклях Гомельскага тэатра. Таленавіта сыграла яна ролі Ламбрыні («Вострыя Афрадзіты»), старой гаспадыні Ніскавуоры («Каменнае гняздо»), жонкі Карпа Маеўскага («Глыбокая плынь»), а цяпер рыхтуе вобраз Лявоніхі («Лявоніха на арбіце»).

Каму не вядомы славутыя «Пінскія вечары»? Галоўны арганізатар іх — заслужаны дзеяч культуры Ісак Барысавіч **Сакольскі** — дырэктар Пінскага гарадскога Дома культуры і рэжысёр Пінскага народнага тэатра.

Вялікай папулярнасцю ў гледачоў карыстаюцца спектаклі, якія ён паставіў («Барабаншчыца», «Алазанская даліна», «Таня» і інш.).

І. Б. Сакольскі прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці горада.

ГЕРОІ НАШЫХ ДЗЁН

ЗАПЯВАЛЫ

Іван СІНЯЎСКІ

Вёска Плёсы — цэнтр калгаса «Перамога» — адным канцом падыходзіць упрытык да шашы Бабруйск—Жлобін. Здзіўляе сама назва вёскі. Вакол — ні возера, ні ракі, ні нават сажалкі. І толькі на ўсход ад Плёсаў, прыкладна ў кіламетры, ёсць нізіна, парослая лазняком і алешнікам. Гэтае балотца ў засушлівае лета так перасыхае, што па ім можна смела хадзіць і ездзіць. У сівую старыну, відаць, тут было возера і вёска атрымала ад яго сваю паэтычную назву. А магчыма, для назвы была іншая прычына. Старажылы ўспамінаюць страшэнную галечу, што панавала тут да Вялікага Кастрычніка. Жыхары пахілых, паделепаватых хат большую частку года сядзелі баз хлеба і солі; адным словам, заплёсквала людзей гора.

Яшчэ едучы да Плёсаў, пераконваемся, што тут нядрэнныя гаспадары. Па ўсім полі — чорныя штабялі торфаперагною. Зямля чыстая ад хмызняку. Прыбрана каменне. Нямала, значыць, папрацавалі механізатары.

— Эх, якое раздолле цяпер трактарыстам і камбайнерам, — хочацца сказаць.

Канцылярыя калгаса — пад адным дахам з прасторным клубам. Насупраць, цераз шашу, новы сельмаг. З канцылярыі відаць доўгія, з пабеленымі сценамі, будынкі жывёлагадоўчых ферм, што наводшыбе ад вёскі.

Старшыня калгаса Якаў Міхайлавіч Шахоўскі — высокі, з дапытлівымі чорнымі вачыма, гадоў сарака пяці. У яго шырокі пакаты лоб і пасівелыя скроні, рухі энергічныя, поціск рукі моцны.

Ён ахвотна расказвае пра планы арцелі на трэці год сямігодкі.

Калгаснікі змагаюцца, каб на кожныя сто гектараў зямлі атрымаць па 350 цэнтнераў малака, 70 цэнтнераў мяса.

Якаў Міхайлавіч называе лепшых свінарак і птушніц. Камсамолкі Ніна Шкрадзюк і Марыя Бандарчук адкармліваюць па 125 свіней. Галіна Самак і Надзежда Чэрнік даглядаюць па тысячы курэй.

— Але найбольш даходаў мяркуем атрымліваць за малако, — кажа старшыня. — Сёлета ў нас 370 дойных кароў.

На жывёлагадоўчых фермах, калі мы прыйшлі туды, работа была ў самым разгары; даяркі прыбіралі стойлы, раздавалі жывёле кукурузны сілас. На падвесная дарозе снавалі ваганеткі.

Пасля даяркі паздымалі спяцоўкі, апрануліся ў беласнежныя халаты. Праз колькі хвілін звонка зацурчала ў даёнках малако, прыемна запахла сырадоем.

З Любай Сакун мы пазнаёміліся, калі яна закончыла даіць цёмнабурую вушастую карову.

— Колькі ж надаілі малака?

— Ад Хмары — дзевяць кілаграмаў, — адказала Люба.

— Гэта ваша рэкардыстка?

— Не. Рэкардыстка вунь, трэцяя ад краю. Муркай клічуць. Летась дала сем тысяч кілаграмаў малака. Між іншым, гэта карова мясцовай пароды...

— Выходзіць, што і каровы простай пароды могуць даваць вялікія надоі? Мабыць, усё залежыць ад корму?

— Не толькі. Два гады назад усе дзесяць кароў маёй групы лічыліся самымі непрадуктыўнымі...

— Значыць?..

— Значыць, малако ў каровы не толькі на языку, як кажа народная прымаўка, але і ў руках даяркі.

...Дзесяць год назад Люба скончыла шэсць класаў. Але вучыцца далей не давялося. Занядужала маці — калгасная цялятніца. І Люба — старэйшая дачка ў сям'і — кінула школу, каб дапамагаць дома. Іншага выйсця яе было. Затым пайшла працаваць на ферму. Улетку пасвіла цялят, а зімой была за даглядчыцу на свінаферме. Хутка яе старанную працу заўважылі. Ужо тады вядомая на ўвесь калгас даярка Аляксандра Сакун, з якой Люба жыла па-суседству ў вёсцы Забалоцце, неяк па дарозе ў Плёсы на вечарынку сказала Любе:

— Пераходзь да нас. Даяркай працаваць.

— Не спраўлюся я ў вас. Апошняй не хачу быць.

— Дзівачка ты, — засмяялася Аляксандра Рыгораўна. — Абы было жаданне. Я дапамагу. Чэснае слова, дапамагу.

— Падумаю...

Нездарма людзі кажуць: прафесіяй авалодаць — не жартачкі. У першы год працы на ферме старалася Люба з усіх сіл, а плён быў малы: яна надаіла крыху больш за дзве тысячы кілаграмаў малака ад каровы.

— Праца даяркі спачатку мне здалася вельмі складанай, — успамінае Люба. — Не соладка быць даяркаю на першых кроках. Малако само не цячэ ў дзёнку. Перамога прыходзіць часам не без слёз... Я спачатку пашкадавала, што кінула свінаферму. А потым падумала: няўжо я горшая за ўсіх?.. Аляксандра мяне ўвесь час павучала; галоўнае — верыць у свае сілы. Помню, сабралі нас, даярак, вынікі падводзіць. Я села на самай апошняй лаўцы. Чакаю, што пра мяне скажуць. Ударніцам прэміі выдалі... Пасля ўспомнілі і пра гультаёў. А пра мяне — ніхто ні слова. Быццам я і не даярка. І так, ведаеце, мне ад гэтага крыўдна стала. Няхай бы хоць пакрытыкавалі. Я выскачыла тады з клуба, бягу дадому, а ў самой — слёзы з вачэй. Такая дурніца была...

А потым я за брашуры хапілася. І тут — зноў тупік: не ўсё прачытанае зразумела. Шасці класаў мала, каб разабрацца ў такой літаратуры. І я ўпершыню тады пашкадавала, што рана кінула вучыцца. Цяпер то я ўзялася, як кажуць, за розум. Сёлета восьмы клас вячэрняй школы канчаць буду...

Люба наведвала заняткі школы даярак, створаныя ў калгасе «Перамога» па ініцыятыве Аляксандры Сакун. (Гэтая школа існуе і цяпер. У школе чытаюць лекцыі заатэхнік, агранам, ветурач, настаўнікі. Перадавыя даяркі часта дзеляцца сваім вопытам работы). Аднак у яе кароў па-ранейшаму былі нізкія надоі. Аляксандра Рыгораўна падбадзёрвала яе:

— Зразумей, перамога не адразу прыходзіць.

І чым больш падцерагалі Любу няўдачы (нейкі час хварэлі аж дзве каровы), тым больш настойлівай была ў яе думка: абавязкова павялічыць надоі. І Люба старалася...

А неяк Аляксандра Сакун прапанавала ёй:

— Прымай, Люба, маіх кароў...

— А ты што, пойдзеш ад нас? — нічога не разумеючы, перапытала Люба (каровы, якіх даглядала Аляксандра Рыгораўна, былі самыя лепшыя на ферме).

— Не, Люба, я застаюся тут працаваць. Ферма — гэта мой другі дом. Я перадаю сваіх кароў як узнагароду за тваю шчырую працу. А сама вазьму тваіх. Вопыту ў мяне больш. Зразумела?

— Ды ў цябе ж сэрца якое, Саша. Дай я пацалую цябе... — і Люба моцна-моцна абняла Аляксандру. І тут жа не стрывала, заплакала.

— Дзівачка ты, Люба, — казала Аляксандра. — Я хачу, каб усе нашы даяркі былі перадавымі. Інакш, Люба, і быць не можа: у нас адны імкненні... Ты ж гэта сама разумееш...

Люба слухала сяброўку з затоеным дыханнем, а ў галаве з усёй яснасцю паўставала пытанне: «А ці паступіла б і я так, як цяпер Саша?..»

Мінуў яшчэ год. Справы Забалоцкай жывёлагадоўчай фермы прыкметна пайшлі ўгару. Не было ні адной даяркі, якая не надаіла б па 3 тысячы кілаграмаў малака ад каровы. Асаблівых поспехаў дамаглася Аляксандра Рыгораўна Сакун: ад першацёлак яна атрымала па 3.500 кілаграмаў! Люба надаіла ад кожнай каровы па 3.159 кілаграмаў малака. Гэта была яе першая значная перамога.

Вестка пра тое, што Аляксандры Рыгораўне Сакун Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы, маланкай абляцела калгас. Гэта яшчэ больш акрыліла людзей арцелі. Як жа! Іх зямлячка стала героем.

— Дзякуй, вялікае дзякуй вам, — ад шчасця не знаходзіла слоў Аляксандра.—Гэта ж не толькі мне ўзнагарода, гэта ж і вам. Без вас я ні за што не стала б героем...

З чарговага сходу даярак Люба Сакун вярнулася дахаты ўсхваляваная. Там гаварылі і пра новыя абавязацельствы працаўнікоў ферм. Выступала і Люба. У час яе прамовы хтосьці з даярак з другой брыгады кінуў:

— Добра табе хваліцца. А што б ты сказала, каб цябе паставілі на маю групу. Не каррвы, а адна скура, ды косці, а Лысуха дык на тры саскі доіша. Вось і атрымай ад іх шмат малака.

Гэтыя словы цяжкім каменем ляглі на сэрца Любы. Не давалі спакою і дома.

На двары была ноч. Ішоў дождж. Раз-пораз стукала акаціна. Парывісты вецер гайдаў ліпу, што была ля хаты, і скуголіў у коміне. Люба не магла заснуць, уздыхала. «Цікава, што ты сказала б, каб цябе паставілі даіць маю групу...», — успамінала яна рэпліку даяркі з другой брыгады. Любе прыгадаўся выдатны пачын Валянціны Гаганавай. «А што, калі б і мне пайсці на адстаючую ферму, што ў вёсцы Плёсы, узяць там самых непрадуктыўных кароў?..»

Люба разумела, што з гэтым крокам звязана нямала цяжкасцей. Затое ж, калі ўдасца на новым месцы дамагчыся поспехаў, гэта будзе моцным ударам па гультаях.

Люба апранулася і пайшла да Аляксандры Сакун.

Аляксандра яшчэ не спала, чытала.

— Што-небудзь на ферме здарылася? — захвалявалася яна.

— Нічога асаблівага. Я прыйшла параіцца.

Люба падзялілася сваімі думкамі.

— Рашэнне тваё правільнае, — падтрымала Аляксандра.

І яшчэ прайшло два гады. Для Любы яны былі часам напружанай працы і трывогі. Яна зразумела, што прачытаных кніг по догляду жывёлы і заняткаў у школе недастаткова. Яна ездзіла ў перадавыя калгасы Віцебскай вобласці, была ўдзельніцай выстаўкі ў Маскве. Усюды імкнулася пераняць новае, перадавое.

— Калі па якой-небудзь прычыне надоі малака зніжаюцца на ферме, — гаворыць старшыня арцелі А. Шахоўскі, — Люба тады нікому ў праўленні не дае спакою. Такі яна ўжо чалавек...

Сама Люба пра гэта вось што кажа:

— Мяне турбуюць справы ўсёй фермы. Бо адзін, як кажуць, у полі не воін.

Летась Люба надаіла больш чатырох з паловай тысяч літраў ад кожнай каровы. Значыць, і каровы простай пароды могуць даваць шмат малака!

— Гэта яшчэ не мяжа, — заяўляе Люба. — Сёлета ў гонар XXII з'езду роднай партыі я абавязваюся надаіць па 5.000 кілаграмаў ад кожнай каровы.

Слова сваё даярка падмацоўвае справай. Так, у студзені яна надаіла па 332 кілаграмы малака, у лютым — 354, а ў сакавіку — 400 ад кожнай дойнай каровы.

Можа скласціся ўражанне, быццам Любе Сакун толькі адно і карціць — гэта павышэнне надояў малака. Гэта далёка не так.

Хто ўнёс прапанову арганізаваць пры фермах чырвоны куток?

— Люба Сакун.

Па чыёй ініцыятыве ў арцелі быў створан універсітэт культуры, які наведвае зараз каля 400 чалавек?

— Любы Сакун.

Хто з'яўляецца адным з актыўных чытачоў калгаснай бібліятэкі?

— Люба Сакун.

Хто агітаваў моладзь калгаса пайсці працаваць на жывёлагадоўчыя фермы? (Зараз тут працуе больш 30 камсамольцаў).

— Камсорг Люба Сакун.

Хто арганізаваў гэтай зімой з моладдзю пяць нядзельнікаў па вывазцы ўгнаенняў на палі?

— Таксама Люба Сакун.

Яшчэ і года няма, як Люба стала членам вялікай партыі Леніна. Па ініцыятыве даяркі, напрыклад, у першай брыгадзе распачата будаўніцтва новага тыпавога кароўніка і наладжана ў клубе сістэматычная дэманстрацыя сельскагаспадарчых фільмаў.

Як дэпутат раённага Савета Люба Сакун чула прыслухоўваецца да запатрабаванняў выбаршчыкаў. Люба Іванаўна — член гаркома партыі і абкома камсамола.

За старанную працу на жывёлагадоўчай ферме і за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Любе Іванаўне Сакун двойчы ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР і ордэнам «Знак пашаны».

Нядаўна даяркам-ударніцам калгаса «Перамога» прысвоена званне брыгады камуністычнай працы. У брыгаду ўвайшло 13 чалавек: Вера Алфяровіч, Ніна Бутоўская, Раіса Шурын, Люба Самак, Аляксандра Сакун, Вера Бандарчук і інш. Брыгадзірам выбрана Люба Сакун.

На першай жа нарадзе членаў брыгады камуністычнай працы Любе заявіла:

— Летась я атрымала 12 тысяч рублёў на працадні. Акрамя гэтага, мне выдалі дадатковай аплаты і прэмій каля 5 тысяч рублёў. Усю дадатковую аплату і ўсе прэміі, што налічваюць мне, я прашу залічыць у фонд новабудоўляў калгаса. Няхай наш калгас «Перамога» будзе яшчэ больш багатым.

...У Плёсах увечары зяе электрычнасць. У калгасным клубе грае гармонік. Гучыць бадзёрая песня.

— Гэта Сакуны забалоцкую моладзь у клуб на рэпетацыю вядуць, — тлумачыць старшыня. — Яны ў нас усюды першыя: і на працы, і ў песні. Гэта Люба і Саша. Адным словам, запявалы...

Калі я ад'язджаў з калгаса, на душы было светла. Радавалі і вясна, такая дружная і цёплая, і людзі, працавітыя, слаўныя запявалы будучыні...

Актыўна ўдзельнічаюць у танцавальным гуртку мастацкай самадзейнасці будаўнічага трэста № 4 Мінска зборшчыца гадзіннікавага завода Ала Грыневіч, студэнт тэхнікума савецкага гандлю Генадзь Пістоленка і лабарантка Акадэміі навук БССР Іна Ермакова. **На здымку** вы бачыце іх у танцы «Чэшская полька».

Фота Ул. Крука.

Часопісы ў красавіку

«ПОЛЫМЯ»

Нумар адкрываецца вершамі маладога паэта А. Наўроцкага. Друкуюцца вершы Р. Барадуліна, А. Вольскага, С. Шушкевіча, А. Дзеружынскага, А. Платнера.

Некалькі апавяданняў пад агульным загалоўкам «З новай кнігі» публікуе Я. Брыль. Змешчана падборка кароткіх апавяданняў Б. Сачанкі. Надрукаваны апавяданні Р. Сабаленкі «Аўтограф» і В. Карамазава «Букініч», аповесць Ул. Караткевіча «Раман Ракута».

«Зялёнае — колер шчасця» — так назвалі свой нарыс А. Адамовіч і К. Бердыеў. Друкуецца артыкул Рыгора Шкрабы «Кнігу прачытаў крытык».

У раздзеле «Успаміны, дакументы» — артыкул Ул. Калесніка «Песня з-за крат» і фрагменты з «Лукішскага дзённіка» Алеся Салагуба.

Бібліяграфічныя матэрыялы прадстаўлены ў нумары рэцэнзіямі Я. Семяжона на II том «Беларускіх народных песень» у запісе Р. Шырмы, Я. Усікава на зборнік нарысаў-успамінаў М. Хведаровіча «Памятныя сустрэчы» і М. Модэля на кнігу «Майстры беларускай сцэны».

Надрукавана некалькі кароткіх рэцэнзій і «Дзядоўнік на Парнасе».

ХТО ШУКАЕ, ТОЙ ЗНАХОДЗІЦЬ

Работнікі Дзяржынскай раённай бібліятэкі Б. Сівашынская, А. Бядрыцкая і Ж. Скарабагатая аддаюць шмат увагі прапагандзе сельскагаспадарчых ведаў. Рэгулярна аднаўляецца пастаянная выстаўка «Навінкі сельскагаспадарчай літаратуры».

На фотамантажы «У працы натхнёнай і творчай — героіка нашых будняў» — здымкі лепшых людзей раёна: даярак, свінарак, звеннявых, механізатараў, брыгадзіраў. У спецыяльным альбоме — матэрыялы раённай і абласной газет пра вопыт перадавікоў сельскай гаспадаркі. Есць мантажы і стэнды, якія прапагандуюць сямігадовы план раёна, абавязацельствы, узятыя на 1961 г.

У калгасы і саўгасы раённая бібліятэка накіравала 19 перасовак, якія абслугоўваюць каля паўтары тысячы чытачоў. Лепшыя прапагандысты кнігі Люба Тамарына (вёска Невялічкі, калгас імя Сталіна), Ганна Біжака (вёска Бакінава, калгас імя Кірава), Эдуард Татарыцкі (вёска Лісоўшчына, калгас «Іскра») дамагліся, што кнігі чытаюць у кожным калгасным двары.

Бібліятэка праводзіць масавыя мерапрыемствы: тэматычныя вечары, канферэнцыі чытачоў, кніжныя агляды.

Добрае ўражанне ў чытачоў пакінуў вечар «Імя Дзяржынскага — гордасць і слава, слова дзяржынцаў — цвярдзей металу». Старшыня перадавога ў раёне калгаса імя Фалько В. Шайкоўскі расказаў пра поспехі гаспадаркі і планы на будучае. Лепшая даглядчыца цялят з калгаса імя Сталіна Яніна Бандак падзялілася вопытам работы, расказала, як жывёлаводы арцелі змагаюцца за выкананне сацыялістычных абавязацельстваў і як ім дапамагаюць веды, набытыя з кніг.

Цікава прайшла канферэнцыя чытачоў па рабоце Ул. І. Леніна «Вялікі пачын». У ёй прынялі актыўны ўдзел брыгадзір калектыву камуністычнай працы В. Лучына, ударнік камуністычнай працы І. Данілкін, калгаснікі, рабочыя, партыйныя і савецкія работнікі раёна. Пасля канферэнцыі павялічыўся попыт чытаноў на творы правадыра, узрасла цікавасць да кніг і брашур пра наватараў і перадавікоў вытворчасці, пра тых, хто вучыцца жыць і працаваць па-камуністычнаму.

Бібліятэка не толькі нясе да працоўных дасягненні навукі і перадавога вопыту, яна дапамагае ім змагацца за новага чалавека, супраць лодараў, абібокаў, хапуг. Тэме працоўнага выхавання былі прысвечаны канферэнцыі «Не праходзьце міма», «Хто не працуе, той не есць». Напярэдадні канферэнцый, як правіла, афармляюцца адпаведныя кніжныя выстаўкі, плакаты і ў самой бібліятэцы, і ў клубах саўгасаў, калгасаў і прадпрыемстваў. Праводзяцца бібліяграфічныя агляды літаратуры. На канферэнцыях выступалі раённы пракурор Н. Хурсік, начальнік аддзялення міліцыі В. Прышчэпа, сакратар райкома камсамола І. Пашкевіч, настаўнікі, рабочыя, калгаснікі.

У час двухмесячніка прапаганды сельскагаспадарчай літаратуры раённая бібліятэка стала больш дапамагаць сельскім прапагандыстам кнігі. Для іх арганізавалі семінар, на якім правялі паказальныя канферэнцыі чытачоў, тэматычныя вечары.

Добра прапагандуе сельскагаспадарчыя веды клубная бібліятэка ў саўгасе «Путчына», загадвае якой Тамара Ханецкая. Яна дапамагла аформіць наглядную агітацыю ў чырвоных кутках ферм у Саковічах і Гаруцішках, скамплектавала для іх літаратуру па жывёлагадоўлі. Для рабочых саўгасаў у вёсках Перацяткі і Вяртнікі арганізаваны бібліятэчкі-перасоўкі. Бібліятэка за апошні час папоўнілася новай сельскагаспадарчай літаратурай.

Ажывілася работа бібліятэкі ў калгасе імя Фалько, якой загадвае А. Калеснік.

Між тым ёсць яшчэ ў раёне бібліятэкі, якія не знайшлі шляхоў да сельскага чытача, не цікавяцца яго запатрабаваннямі. Возьмем для прыкладу саўгас «Камсамолец». Тут ёсць хата-чытальня. Загадчыкам яе лічыцца З. Ліхадзіеўскі. Дзверы гэтай культустановы ад наведвальнікаў засцярагае вялізны замок. Адмыкаецца ён вельмі рэдка. Кнігі, якія атрыманы яшчэ ў мінулым годзе, да гэтага часу не зарэгістраваны і не выдаюцца чытачам. Бібліятэчкі-перасоўкі існуюць толькі ў справаздачах, якія загадчык дасылае ў аддзел культуры. На самай справе ў іх больш года ўжо не абменьваецца літаратура. Няма калі З. Ліхадзіеўскаму працаваць у хаце-чытальні. Ён знайшоў дадатковую, больш даходную працу: вядзе урокі ў Татарщчынскай сярэдняй школе. Але і ранейшую пасаду не пакідае. Як кажуць, на двух крэслах сядзіць. Абы грошы. Скардзяцца на дрэнную работу бібліятэк чытачы з калгаса «Перамога» (там нават загадчыка няма!) з пасёлка Фаніпаль, з калгаса імя М. Горкага.

Прапаганда сельскагаспадарчай кнігі — адказная справа і нельга ставіцца да яе абыякава.

А. БЕЛАВУС.

ПАМЯЦЬ СЭРЦА

У цэнтры Слуцка рыхтавалі плянаўку для стаянкі таксі. Магутны бульдозер нібы брытвай зрэзваў кучы бітай цэглы, апошнія сляды даўно адгрымеўшай вайны.

Раптам да бульдозера падбегла немаладая жанчына і трывожна закрычала:

— Тут жа людзі пахаваны, што ж ты, сынок, робіш!

Мне ўспомніўся сонечны гарачы дзень 26 чэрвеня 1941 года. Над Слуцкам навісла велізарная хмара дыму і пылу. Горад гарэў ад нясыпных бамбардзіровак. З захаду чорнай вужакай упаўзала ў Слуцк браніраваная калона ворага. Салдаты сядзелі на машынах і бронетранспарцёрах, нібы на парадзе.

І раптам перад імі бліснуў востры язычок полымя. Стрэл і выбух зліліся ў адно. Пярэдні бронетранспарцёр з салдатамі ўспыхнуў, зачадзіў густым дымам. Яшчэ стрэл—і ў канаву паляцела другая машына. Калона спынілася. А гармата пасылала ў ворага снарад за снарадам.

Паўгадзіну цягнуўся паядынак двух невядомых савецкіх воінаў з браніраванай калонай. Расстраляўшы снарады, артылерысты леглі за кулямёт і пачалі касіць гітлераўцаў. Але сілы былі няроўнымі. І ўсё ж фашысты не далічыліся сотні салдат і афіцэраў, чатырох аўтамашын і трох бронетранспарцёраў.

Жанчына, якая прасіла бульдазерыста «не чапаць магілу», была сведкай смелага паядынку. Яна памятае, што трупы адважных герояў былі пахаваны на тым месцы, дзе цяпер стаянка таксі. Усе тры гады акупацыі чыясьці клапатлівая рука клала на магілу жывыя кветкі. Фашысты знішчалі іх, але праз ноч на магільным узгорачку зноў палымнелі ружы ці незабудкі.

Неяк балюча ўсведамляць, што праз некалькі дзён асфальт закрые апошні след магілы. Можа б варта было на гэтым месцы паставіць мемарыяльную дошку, на ёй коратка расказаць пра подзвіг двух невядомых салдат.

Некалькі слоў пра мемарыяльныя дошкі. У Слуцку імі адзначаны ўсе месцы, звязаныя з гісторыяй рэвалюцыйнага руху і грамадзянскай вайны. Што ж, такую ініцыятыву можна толькі вітаць, каб яна была даведзена да канца. Але чамусьці няма мемарыяльных дошак на месцах, звязаных з гісторыяй партызанскага руху і вызвалення горада ад фашысцкіх захопнікаў.

Уздоўж дарог Беларусі вайна пакінула нямала магіл. На адных з іх стаяць велічныя помнікі, як ля вёскі Селішчы. На другіх... Лепей звернемся да фактаў.

...На пяты дзень вайны група нашых воінаў стрымлівала націск матарызаванага палка гітлераўцаў ля пасёлка Кучына па Бабруйскай шашы. Шэсць гадзін цягнуўся бой. Каля двухсот бярозавых крыжоў вырасла ў сасонніку. Загінулі амаль усе абаронцы пасёлка, якія на шэсць гадзін затрымалі шалёны націск ворага. А летам 1941 г. гэтыя шэсць гадзін многае значылі.

Жыхары пасёлка расказваюць, што ў час бою па шашы на ўсход выехалі апошнія дзве аўтамашыны з выхаванцамі дзіцячых дамоў.

Цяпер на брацкай магіле помнік. Але які! Тынкоўка асыпалася яшчэ мінулым летам. Застаўся адзін мураваны шкілет, які больш нагадвае комін. Дажджы і час сцерлі вершаваны надпіс, дзе напаміналася аб тым, каб кожны прахожы пакланіўся гэтай магіле. Зарасла быльнягом і магіла.

— Няўжо кельга навесці парадак на магіле? — пытаю ў старшыні Анговіцкага сельсавета т. Дз'якава.

— У нас ёсць грошы, што-небудзь прыдумаем, — адказвае ён такім тонам, нібы гутарка ідзе аб рамонце мосціка ці дарогі. А т. Дз'якаў сам удзельнік Айчыннай вайны. Няўжо чалавеку не соромна за такі стан магілы.

Ёсць на тэрыторыі сельсавета школа, вучні якой у Дзень перамогі прыносяць на магілу загінуўшых воінаў кветкі. І ўсё.

— Хто ж адказвае ў раёне за стан помнікаў героям Вялікай Айчыннай вайны?—з такім пытаннем мы звярнуліся да ваенкома.

— Вядома хто—сельсаветы,—адказалі нам.

— Ну, а калі сельсаветы глядзяць на гэта праз пальцы?

— Мабыць, райвыканком.

На самай справе ніхто канкрэтна не адказвае за гэта. У горадзе шмат былых афіцэраў, якія выйшлі ў запас або ў адстаўку. Амаль усе яны —непасрэдныя ўдзельнікі Айчыннай вайны. Можа варта было б стварыць пры ваенкамаце ці райвыканкоме савет ветэранаў вайны, які б займаўся пытаннямі добраўпарадкавання магіл, помнікаў. Упэўнены, што калі б таварышы з такога савета пабывалі хоць раз у Анговіцкім сельсавеце, дык магіла ў Кучыне не была б занядбанай. І надпісы на помніках над брацкімі магіламі ў Слуцку не былі б такімі бязлікімі і трафарэтнымі. Ну, скажам, што хацелі сказаць аўтары такога надпісу: «Слава савецкаму народу—народу пераможцу! Вечная слава героям Вялікай Айчыннай вайны!» Мы не выдумалі гэтай эпітафіі. Яна чорным па беламу напісана на адным з помнікаў, дзе захаваны загінуўшыя пры вызваленні Случчыны салдаты, партызаны, афіцэры Савецкай Арміі. Прыкладна ў такім духу складзены надпісы і на астатніх помніках, устаноўленых на брацкіх магілах. Складалі іх, як звычайна, работнікі з гаркамунгаса, якія не абцяжвалі сябе пошукамі яркіх, дакладных і разам з тым простых слоў. Надпіс на помніку—гэта таксама прапаганда. Успомнім поўныя рэвалюцыйнага пафасу словы на помніках героям рэвалюцыі на Марсавым полі ў Ленінградзе. Іх нельга чытаць раўнадушна, кожнае слова бярэ за душу, хвалюе.

Забылі ў Слуцку пра Героя Савецкага Саюза гвардыі капітана Зуба, які загінуў у баях за вызваленне горада. Хіба нельга было назваць яго імем вуліцу, або, скажам, адвесці куток у мясцовым краязнаўчым музеі? Патрэбна толькі адно—жаданне.

Кажуць, што маўчанне—золата. У адносінах да герояў Айчыннай вайны яно хутчэй за ўсё—раўнадушша. Інакш не назавеш адносіны гаспадароў горада і раёна да ўвекавечання памяці праслаўленага партызана Мікалая Бялько, генерал-палкоўніка двойчы Героя Савецкага Саюза І. А. Пліева, пад чым камандаваннем савецкія воіны выганялі са Случчыны гітлераўскую нечысць. А Пётр Маглыш, Дзмітрый Гуляеў? Народ пра гэтых мужных партызан песні складае, а ў музеі—ні слова. Не знойдзеце і вуліц з імем гэтых герояў.

Ёсць у горадзе вуліцы Надрэчная, Зялёная (дарэчы, на ёй няма ні аднаго дрэва), Тупіковая, Вялікае кальцо... Але няма вуліцы з імем пісьменніка-земляка Кузьмы Чорнага...

Аўтару гэтых радкоў летам мінулага года давялося пабываць у якасці турыста ў Чэхаславацкай Сацыялістычнай Рэспубліцы. Там з выключнай увагай і любоўю даглядаюць магілы і помнікі савецкім воінам і чэшскім партызанам, якія загінулі ў барацьбе з фашызмам. У горадзе Готвальдаве ў прыёмным пакоі будынка гарадскога Савета вывешана мемарыяльная дошка, на якой выпісаны імёны тых жыхароў горада, што загінулі ў барацьбе з фашызмам. Добрая ініцыятыва! Яе можна толькі вітаць. У Празе на адным з заводаў мы зноў убачылі падобную карціну. У чырвоным кутку на відным месцы высечаны імёны афяр фашызму — былых рабочых прадпрыемства.

Дваццаць гадоў мінула з таго часу, як ураган вайны абрушыўся на нашу краіну. Вырасла новае пакаленне людзей, якое вайну ведае па кінафільмах і кнігах. Яно не павінна забываць пра тых, хто аддаў жыццё за блакітнае неба і радасны смех дзяцей.

П. МІХАЙЛОЎСКІ.

ПАЧЫН КАМСАМОЛКІ

Галіна Белгародская працавала інструктарам Зельвенскага раённага Дома культуры. Умелы арганізатар гульняў, добры масавік-зацейнік, яна цікава арганізоўвала аднапчынак жыхароў раённага цэнтра. Цёпла сустракалі гледачы выступленні Галіны на сцэне.

Галіна Белгародская часта выязджала ў вёску, практычна дапамагала сельскім клубам, дамам культуры. Аднойчы, вярнуўшыся з паездкі ў Казловіцкі сельскі клуб, яна зайшла да загадчыка раённага аддзела культуры В. Кіслова.

— Справы ў тым клубе дрэнныя,— расказвала яна загадчыку.—Жыхары вёскі незадаволены. Я вырашыла пайсці працаваць у гэтую культасветустанову.

І вось ужо два месяцы Галіна ўзначальвае Казловіцкі сельскі клуб. Тут цяпер вечарамі заўсёды поўна людзей. Калектыў мастацкай самадзейнасці клуба нядаўна выступаў з канцэртамі.

Ажывілася работа ў Казловіцкім сельскім клубе. Вялікая заслуга ў гэтым Галіны Белгародскай.

С. ПРАСНЯК.

Гэта было пабудавана

Выстаўка праектаў лепшых жылых і грамадзянскіх будынкаў, пабудаваных у Беларусі ў 1960 годзе, адкрыта ў мінскім доме архітэктараў. Для ўсеагульнага агляду прадстаўлены тэхнічная дакументацыя і матэрыялы на 54 будынкі. Сярод іх праекты жылых дамоў з сілікатных блокаў, пабудаваных у Мінску; дзіцячага саду на 125 месц, збудаванага ў Брэсце; школы на 500 вучняў, узведзенай у Віцебску і інтэрната на 210 месц, пабудаванага ў Магілёве.

У Гомелі на цэнтральнай вуліцы—праспекце імя Леніна — нядаўна адкрыўся самы буйны ў горадзе кніжны магазін. Тут вялікі выбар мастацкай, палітычнай і тэхнічнай літаратуры на рускай і беларускай мовах, аддзелы музычнай літаратуры і прадукцыі выяўленчага мастацтва.

На здымку: у новым кніжным магазіне. Работніца швейнай фабрыкі, грамадскі распаўсюджвальнік кніг Валянціна Сапанова падбірае літаратуру для распаўсюджвання на фабрыцы.

Фота М. Мінковіча.

РАДКІ З ПІСЕМ

Нядаўна ў сельскім клубе вёскі Сукневічы адкрыты куток гісторыі партызанскага руху ў Плешчаніцкім раёне. Тут знаходзяцца фатаграфіі юных партызан-камсамольцаў, што загінулі геройскай смерцю недалёка ад вёскі, — А. Алёшкі, В. Жука, А. Ясюкевіча, былога камандзіра партызанскага атрада «Спартак», чэхаславацкага камуніста Ф. Горака, а таксама каштоўныя дакументы з партызанскіх часоў, сярод якіх падпольная газета «Бальшавіцкая праўда» за 11 лістапада 1942 г. і лістоўкі на нямецкай мове, адрасаваныя гітлераўскім салдатам.

Г. БЛІЗНЮК,
загадчык Сукневіцкай сельскай бібліятэкі, былы партызан.

* * *

У калгасе «Бальшавік» (Зельвенскі раён) маладая даярка т. Міцкевіч арганізавала ў сваёй хаце пункт выдачы кніг, якія яна для гэтай мэты ўзяла ў раённай бібліятэцы.

П. СЯРГЕЕЎ.

* * *

У сацыялістычным спаборніцтве ўстаноў культуры Брэсцкай вобласці першае месца заняў Пінскі гарадскі аддзел культуры. На абласной нарадзе работнікаў культуры ён атрымаў пераходны Чырвоны сцяг абкома КПБ і абласнога ўпраўлення культуры.

І. КАЧАЛОЎСКІ,
загадчык Чэрскага сельскага клуба.

* * *

Добра працуе бібліятэка ў Доме культуры калгаса «Расія» (вёска Дэмбрава Шчучынскага раёна). На раённым злёце культработнікаў ёй было прысвоена званне ўстановы камуністычнай культуры, а бібліятэкарцы тав. В. Слабуха — званне ўдарніка камуністычнай працы.

І. РАСЕНІН,
студэнт Навагрудскага сельскагаспадарчага тэхнікума.

* * *

Пры Мазырскім клубе «Будаўнік» створаны на базе драмгуртка сярэдняй школы № 7 дзіцячы тэатральны калектыў які рыхтуе спектакль «Пецька ў космасе» па камедыі І. Дзіка.

З кінакамерай па рэспубліцы

„Савецкая Беларусь" № 8

Паляводчая брыгада, якой кіруе ў саўгасе «Любанскі» Уладзімір Ранейскі, летась з плошчы ў 382 гектары сабрала па 14,7 цэнтнера збожжавых. За яшчэ больш высокі ўраджай змагаецца брыгада сёлета. Пра ўсё гэта і расказана ў першым сюжэце кінажурнала «Савецкая Беларусь» № 8, які выйшаў на экраны рэспублікі.

Другі сюжэт часопіса прысвечан лепшай даярцы саўгаса «Зарэчча» Мінскай вобласці Марыі Фёдараўне Дзегцяровай, якая надаіла ў мінулым годзе ад кожнай замацаванай за ёй каровы па 5 680 кілаграмаў малака. Сёлета М. Дзегцярова абавязалася надаіць па 6 000 кілаграмаў малака.

З наступных кінакадраў гледачы даведваюцца аб палітэхнізацыі навучання ў шостай Гродзенскай сярэдняй школе, аб тым, што Мінскаму паштамту за перамогу ў сацыялістычным спаборніцтве ўручан пераходны Чырвоны сцяг Міністэрства сувязі рэспублікі.

З цікавасцю будуць прагледжаны сюжэт аб знаходжанні ў сталіцы Беларусі гасцей з Германскай Дэмакратычнай Рэспублікі, а таксама кінакадры, якія расказваюць, што Гарадзейскі цукровы завод атрымаў нядаўна для перапрацоўкі вялікую партыю кубінскага трыснёговага цукрусырцу.

Гледачы пазнаёмяцца з членамі калектыву Народнага тэатра Магілёўскага клуба чыгуначнікаў, убачаць спаборніцтвы на першынство Савецкага Саюза па вольнай барацьбе, якія праходзілі ў Мінску і ў якіх упершыню чэмпіёнамі Савецкага Саюза па вольнай барацьбе сталі беларускія асілкі — Уладзімір Лятун і Аляксандр Мядзведзь.

ЗА РАБОЧЫМ СТАЛОМ ПІСЬМЕННІКА

Сучаснасць — галоўнае



— Над чым Вы працуеце? Што Вас хвалюе? Якімі новымі творамі парадуеце чытача? — звярнуўся наш карэспандэнт з запытаннямі да пісьменніка Аляксандра Міронава.

— Здараецца так, — сказаў А. Міронаў, — што нават самыя прадуманыя, самыя дакладныя планы і задумы не здзяйсняюцца, або, у лепшым выпадку, адсоўваюцца на няпэўны час. У нашай цудоўнай рэчаіснасці гэта заканамерна: само жыццё ставіць перад пісьменнікам новыя, надзвычай важныя і актуальныя задачы, вырашэнне якіх нельга адкладаць ні на хвіліну.

Так адбылося і са мною. Сабраў, падрыхтаваў матэрыял для новага рамана, пачаў працу над ім, і раптам усё гэта адыйшло нават не на другі, а на трэці, на чацвёрты план.

Толькі што вярнуўся з паездкі на адзін з цікавых участкаў дзяржаўнай граніцы СССР. Пабыў там не так ужо і многа, а ўражанняў, нататак, матэрыялаў ад сустрэч і гутарак з салдатамі і афіцэрамі-пагранічнікамі — не ахапіць. Галоўнае — людзі: баявыя, загартаваныя, адважныя, за плячыма ў якіх дзесяткі сутыкненняў з варожымі лазутчыкамі, са здраднікамі Радзімы, з бандыцкімі шайкамі і контрабандыстамі; зусім яшчэ маладыя салдаты, якія год — паўтара назад працавалі на прадпрыемствах і ў калгасах, дзе многія з іх былі ўдарнікамі і членамі брыгад камуністычнай працы, сёння маюць на асабістым рахунку затрыманне не аднаго парушальніка дзяржаўнай граніцы Савецкага Саюза; маці-гераіня, якая выхоўвае дзесяцярых дзяцей — паўтара гады малодшаму і дзевятнаццаты год старэйшаму — працуе загадчыцай малочна-таварнай фермы буйнага калгаса, за апошнія гады затрымала трох парушальнікаў дзяржаўнай граніцы і ўзнагароджана за гэта баявым медалем «За отличие в охране Государственной границы СССР». Гэта яе, старанную працаўніцу, вылучылі пагранічнікі сваім кандыдатам, а потым аднадушна выбралі дэпутатам мясцовага Савета дэпутатаў працоўных. Гэта яна з'явілася адным з арганізатараў мясцовай дружыны добраахвотнікаў-патрыётаў аховы дзяржаўнай граніцы, якія сталі вернымі і надзейнымі памочнікамі воінаў — пільных вартавых свяшчэнных рубяжоў нашай Айчыны.

Вось пра іх я і хачу расказаць чытачам у першую чаргу. Таму што іх высакародны прыклад вучыць усіх нас і яшчэ большай рэвалюцыйнай пільнасці, і самаадданаму служэнню свайму народу, і любві да нашай вялікай і магутнай краіны сацыялізма. Гэтыя людзі — нашы сучаснікі, а іменна пра выдатных нашых сучасникаў і хочацца пісаць сапраўды ўсхвалявана і хораша.

Услед за гэтай — другая тэма: дакументальная аповесць пра чакіста, пра афіцэра органаў дзяржаўнай бяспекі. Шмат год назад у адной з вёсак на акупіраванай гітлераўцамі нашай тэрыторыі ад рукі здрадніка-паліцая загінуў малады партызан. Ні імя загінуўшага, ні асоба забойцы вядомы не былі. Быў устаноўлены толькі факт забойства. І вось за раскрыццё ўсіх акалічнасцей, звязаных з гэтым фактам, бярэцца чакіст. Пра яго і пра тое, як ён выканаў неверагодна цяжкую, але надзвычай высакародную задачу, я і хачу расказаць у сваёй аповесці, дзе не будзе ніводнага выдуманага факту, ніводнага выдуманага прозвішча, а толькі чыстая праўда. Могуць сказаць: чарговы дэтэктыў? Не! На жаль, у нас вельмі мала дакументальных твораў пра руплівую і гераічную дзейнасць работнікаў органаў дзяржаўнай бяспекі, і я лічу сваім першачарговым абавязкам зрабіць нешта ў гэтым напрамку.

І, нарэшце, яшчэ адно: дакументальная аповесць Е. Г. Акушэвіча «Агні ў родных лясах» — пра баявыя дзеянні партызанскага злучэння ў тыле ворага на часова акупіраванай фашысцкімі захопнікамі тэрыторыі нашай рэспублікі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Гэта будзе пятая кніга пра беларускіх партызан, якая выйдзе ў свет у маёй літаратурнай апрацоўцы. Захапляючая, хвалюючая праца, ад якой, калі паглыбішся ў яе, літаральна няма сіл адарвацца. І як шкада, што пакуль усё яшчэ вельмі мала пісьменнікаў бярэцца за яе.

Вось, у асноўным, усё, што я павінен буду зрабіць і зраблю ў сёлетнім годзе; хочацца зрабіць як мага лепш, бо пісаць пра тое, аб чым я гаварыў, без душы, без хвалявання і творчай страсці проста нельга.

— А як з публіцыстычнымі рэчамі? Мы прывыклі бачыць у газетах і часопісах Вашы надзённыя артыкулы і нарысы.

— Ну, апроч усяго гэтага, — вядома ж і публіцыстычная, нарысавая праца ў нашых газетах і часопісах. Але яна — штодзённая праца, і пра яе няма патрэбы гаварыць.

Юнакам будзе цікава прачытаць

Дзесяць год назад нашы юныя чытачы пазнаёміліся з першай кнігай Алеся Шашкова. З таго часу выйшла некалькі зборнікаў апавяданняў пісьменніка і аповесць «Белы камень».

У свой час крытыка, адзначаючы добрыя якасці гэтых твораў, указвала і на сур'ёзныя іх недахопы — наяўнасць нуднай дыдактыкі, слабае пранікненне ў псіхалогію герояў. Новая аповесць «Лань — рака лясная»*) — пераканаўчае сведчанне росту пісьменніцкага майстэрства А. Шашкова і пераадолення недахопаў, уласцівых папярэднім яго творам.

У цэнтры аповесці прыгоды трох юных герояў — Валерыка, Аліка і Віці. Іх жыццё і мары цесна звязаны з калгасам, будаўніцтвам міжкалгаснай ГЭС на Ціхай Лані; сяброў шчыра захапляюць расказы пра гераічныя справы партызан у гады Айчыннай вайны. І самі хлопчыкі прымаюць актыўны ўдзел у нашым жыцці.

Найбольш выразны ў творы вобраз пятнаццацігадовага Валерыка Гуза. Яго «баяліся ўсе вясковыя каты і сабакі. Убачаць — і хто куды!» У час канікул ён нічым сур'ёзным не займаецца. Гэта вельмі рухавы, вельмі здатны на розныя свавольныя ўчынкі хлопчык. Нават тады, калі ў Валерыка ўзнікае жаданне ўзяцца за карысную справу і калі ён, напрыклад, прапануе свінарцы Веры Сімуковай дапамагчы ў працы, яму адмаўляюць, памятаючы пра яго свавольствы. З-за сваіх выдумак хлапчук часта трапляе ў непрыемнае становішча, у небяспечныя прыгоды. Мы бачым імкненне пісьменніка паказаць Валерыка ва ўсёй супярэчлівасці і складанасці яго паводзін. Дзякуючы сваёй кемлівасці, уменню хутка арыентавацца нават у цяжкіх абставінах, хлопчык можа быць вельмі карысным у агульнай справе, якою ён здольны захапіцца разам з сябрамі. Таму, пры ўсіх адмоўных якасцях характару Валерыка, чытач не адчувае антыпатыі да яго. Наадварот: нам падабаецца дапытлівасць хлопчыка, яго жвавасць. Гэта не якісьці сапсаваны, а проста неарганізаваны хлопчык, які пад плённым уплывам калектыву можа выправіцца. І сапраўды, чытач бачыць, як калектыў уплывае на Валерыка, хоць яго перавыхаванне павінна завяршыцца па-за кнігай. Гэта добра, што пісьменнік не пайшоў па спакусліваму, але лёгкаму шляху паказаць поўнае «выпраўленне» свайго героя к канцу аповесці, дзеянне якой адбываецца на працягу толькі некалькіх дзён.

Другі з трох сяброў-аднагодкаў, Алік — супрацьлегласць Валерыку. Ён прывык абдумваць свае паводзіны і ўчынкі. Перад ім ніколі не стаіць праблема, чым заняцца ў вольны час. Ён заўсёды знаходзіць сабе карысную справу. Ён даглядае ў час канікул калгаснага бычка з жывёлагадоўчай фермы, ходзіць у лес па грыбы, любіць паслухаць захапляючыя апавяданні свайго дзеда, удзельніка партызанскай барацьбы. Вядома, часам і Алік трапляе ў непрыгожыя справы, распачатыя Валерыкам: дзеці ёсць дзеці.

Слабей, чым іншых сяброў-аднагодкаў, чытач уяўляе Лёню Крашалёва, хоць аўтар і імкнецца надзяліць яго адметнымі рысамі характару. У творы ён не нясе самастойнай нагрузкі. Нам здаецца, пісьменніку без усіляких страт можна было не ўводзіць у твор гэты вобраз.

Цікавы ў аповесці Алікаў дзед Рыгор Вайцёнак. Гэта чалавек з багатым жыццёвым вопытам. З любоўю ўспамінае Рыгор Пятровіч пра гераічныя справы землякоў — партызан, пра свайго сябра камандзіра партызанскай разведкі Крамнёва, беражліва захоўвае яго дзённік.

Напружана разгортваецца сюжэт аповесці. Былы обер-лейтэнант фашысцкіх войск СС Скуратаў-Даноўскі выдае сябе за стрыечнага брата героя — партызана Крамнёва, аб якім жыве добрая памяць у народзе. Ён з'явіўся ў мясціны, дзе загінуў герой, быццам для таго, каб сабраць матэрыял для кнігі аб партызанах, а на самай справе, каб адшукаць у возеры партызанскі скарб. Прайдзісвет Скуратаў умее гладка і праўдападобна хлусіць аб сваім мінулым, выдаваць сябе за чалавека, які быццам многа ў свой час перанёс ад фашыстаў.

Але хоць Скуратаў і нядрэнна валодае сабой, пісьменнік з самага пачатку твора ўмее насцярожыць чытача, які адчувае, што Скуратаў мае нейкія патаемныя намеры, што ён зусім не той, за каго выдае сябе, што ён вораг. Пісьменнік злолеў паступова падвесці чытача да развязкі, трымаючы яго ўвесь час у стане напружанага чакання яе.

Аповесць «Лань — рака лясная» — твор прыгодніцкі ў добрым сэнсе гэтага слова. Апавяданне аб прыгодах герояў — не самамэта для пісьменніка. А. Шашкоў унікнуў небяспекі, якая часам падсцерагае аўтараў прыгодніцкіх твораў, — нанізвання эпізодаў адзін на адзін без абгрунтавання іх заканамернасці.

У сюжэтную тканіну аповесці, дзеянне якой адбываецца ў наш час, пісьменнік даволі ўдала ўплятае цікавыя і захапляючыя апавяданні аб подзвігах партызанаў часоў Айчыннай вайны. Пры гэтым аўтар выявіў сваё ўменне падаць іх так, каб яны выступалі ў творы ў выглядзе перадгісторыі яго важнейшых персанажаў. Герой-партызан Крамнёў, хоць і загінуў ад рукі фашыстаў, жыве ў аповесці, і вобраз яго, яркі і выразны, у агульнай кампазіцыі твора адыгрывае важную ролю. Такімі ж захапляючымі, як і подзвіг Крамнёва, выступаюць у творы задушэўна пададзеныя апавяданні аб трагічнай гібелі 19-гадовага партызана Пеці Кузняцова і хлопчыка-воіна, сына камандзіра атрада. Часам пісьменнік звяртаецца да народнай творчасці, умела ўплятае ў сюжэт аповесці легенды, казкі. Але эпізоды з часоў вайны, фальклорныя ўстаўкі, пейзажныя замалёўкі не абцяжараюць развіццё дзеяння ў аповесці. Яны арганічна ўплятаюцца ў яе сюжэтную тканіну.

З твора відаць, што аўтар умее падбіраць мастацкія дэталі. Тым не менш, у ім сустракаюцца выпадкі (хоць і не частыя), калі пісьменніку здраджвае пачуццё меры. Так, недастаткова пераканаўчыя цяжкія думкі Валерыка Гуза аб сваім, як яму здаецца, непрыгожым прозвішчы. Нават калі і дапусціць, што гэтыя думкі былі ў хлопчыка, мы ўсё ж пасля нідзе на працягу аповесці не бачым, каб прозвішча хлопчыка мела якое-небудзь дачыненне да яго жыцця.

Нельга не адзначыць адну недарэчную дэталь. Адчуваеш, што ў канцы дзеяння адбываецца ў летні час, час школьных канікул, паводле ўсіх прыкмет — гэта чэрвень або ліпень. І аказваецца, што героі твора ўжо з ахвотай ядуць слуцкія бэры, якія быццам бы паспелі. Але ж слуцкія бэры, як вядома, вельмі познія грушы, яны паспяваюць толькі да часу замаразкаў, перад самым наступленнем зімы.

Л. ЦАРАНКОЎ.

*) Алесь Шашкоў. Лань — рака лясная. Аповесць. Дзяржаўнае выдавецтва БССР. Рэдакцыя дзіцячай і юнацкай літаратуры. Мінск, 1960.

Часопісы ў красавіку

«БЕЛАРУСЬ»

Артыкулам «Вясны гарачы подых» адкрываецца нумар. Змешчаны таксама артыкул «Ленінскія клопаты аб беларускім сялянстве» Б. Фіха. Ільічу прысвечаны верш А. Платнера «Дзень нараджэння Леніна».

Рэпартаж Я. Кучара і І. Гусева «Адзін дзень Салігорска» апавядае аб працоўных буднях будаўнікоў калійнага камбіната. Надрукаваны матэрыялы агранома калгаса «Новы быт» С. Дражнік «Упэўнена трымаць компас!», «Агонь творчай думкі» І. Скапарава, «Зубр» кроч ыць па свету» Я. Канапліна.

Нарыс Б. Стральцова і Э. Чэчкі «Вартавыя Радзімы» расказвае пра будні савецкіх пагранічнікаў, П. Тормасава «Чулясць» — аб высакароднай працы савецкіх урачоў.

Дарожныя нататкі Г. Мігая «У далёкай краіне гор» знаёмяць з Эфіопіяй, артыкул Б. Ірыніна «Король спорту» ўзяў старт»—з планамі футбольнай каманды «Беларусь».

Прафесар Б. Жылін выступіў з артыкулам «Лес трэба сеяць, трэба гадаваць», К. Кірэенка — з артыкулам «Супраць цемрашальства».

Да юбілею народнага мастака БССР А. П. Марыкса надрукаван артыкул Г. Барышава «Старэйшы тэатральны мастак», да 80-годдзя з дня нараджэння Янкі Журбы — артыкул Р. Красоўскага «Неспакойнае сэрца».

З мастацкіх твораў змешчаны ўрывак з новага рамана І. Мележа «Людзі на балоце» — «Постаці з цемры», апавяданне І. Грамовіча «Фінця», гумарэска Л. Прокшы «Не дайшоў да кандыдыі», вершы С. Грахоўскага і Н. Чарнушэвіча.

Пад рубрыкай «Новыя кнігі» друкуюцца рэцэнзіі В. Бурносава — на новую кнігу А. Кучара «Аб мастацкай прозе» і Я. Казекі — на зборнік В. Адамчыка «Млечны шлях».

Акрамя гэтага, змешчана шмат нататак, допісаў, якія знаёмяць з гісторыяй і жыццём роднай рэспублікі.

Часопіс багата ілюстраваны.

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

«Мастацкае слова на радыё»

Пад такой назвай быў змешчаны артыкул Ул. Юрэвіча ў 16 нумары нашай газеты за г. г.

Старшыня Камітэта па радыёвяшчанню і тэлебачанню пры Савеце Міністраў БССР тав. В. Несцяровіч паведаміў рэдакцыі наступнае:

Артыкул Ул. Юрэвіча абмеркаваны на пашыраным пасяджэнні мясцкома радыёкамітэта з удзелам рэдактараў, рэжысёраў і дыктараў. Крытыка прызнана правільнай. Прыняты меры для паляпшэння літаратурных перадач. Рэгулярна рэцэнзуюцца новыя кнігі, рыхтуюцца радыёпастаноўкі па многіх творах беларускіх пісьменнікаў («Трывожнае шчасце» І. Шамякіна, «Апошняя сустрэча» Я. Брыля, «Дысертацыя» А. Асіпенкі і інш.). Пачаў выходзіць новы літаратурна-мастацкі часопіс «Зарніцы», які будзе знаёміць слухачоў з навінкамі літаратуры і мастацтва Адноўлены перадачы «Літаратурная віктарына».

Рэдактары сталі больш строга адносіцца да перакладаў мастацкай літаратуры. З гутаркамі аб беларускай мове па радыё выступілі перад работнікамі радыёкамітэта пісьменнік Янка Скрыган, мовазнаўца Ф. Янкоўскі. Такія гутаркі будуць наладжвацца і далей. Намечаны і іншыя мерапрыемствы, ажыццяўленне якіх зробіць літаратурныя перадачы больш змястоўнымі і цікавымі.

Вожык

За смех ці твой калючы, за жарты і гумар
Цябе запрасілі мы ў сённяшні нумар.

Часопіс «Вожык» з'яўляецца працягам выдання ваеннага часу — сатырычнай газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», якая дапамагала народным мсціўцам Беларусі граміць і змішчаць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Больш чым за дваццаць год выйшла 500 нумароў часопіса.

Сёння «Вожык» змагаецца з усім тым, што павінна адыйсці ў нябыт, што замінае нашаму руху наперад.

«Вожык» выводзіць на чыстую ваду бракаробаў, бюракратаў, лайдакоў і прыстасаванцаў, выкрывае прагульшчыкаў, злодзеяў, хапуг — усіх тых, хто сваімі паводзінамі зневажае высокае званне савецкага чалавека.

Гэтыя надзённыя заданні «Вожык» выконвае як сродкамі літаратурных твораў — апавяданняў, баек, гумарэсак, вершаў, фельетонаў, так і дасціпнымі малюнкамі, карыкатурамі, шаржамі. У часопісе сталі пастаяннымі аддзелы «Выбачайце, калі ласка», «На калючкі», «Іглатэрапія», «АТК «Вожыка», «Музей непатрэбных рэчаў», «Як ні дзіўна, але...», матэрыялы якіх грунтуюцца на канкрэтных фактах, на дасланых у рэдакцыю пісьмах працоўных.

У «Вожыку» часта змяшчаюць свае творы П. Броўка, М. Лужаніна, А. Зарыцкі, К. Кірэнка, Ул. Корбан, С. Дзяргай, Э. Валасевіч, М. Чавускі, Р. Сабаленка, М. Калачынскі, М. Скрыпка і маладыя сатырыкі-літаратары.

З карыкатурамі выступаюць у нас мастакі А. Волкаў, С. Раманаў, А. Чуркін, З. Паўлоўскі, Р. Грамыка, М. Гурло, В. Ціхановіч, В. Ждан, Е. Ганкін і інш.

Часопіс сістэматычна друкуе лепшыя ўзоры сатыры і гумару літаратараў братніх савецкіх рэспублік, літаратурныя творы і карыкатуры з краін народнай дэмакратыі, а таксама матэрыялы з часопісаў іншых краін свету.

Ужо чатыры гады, як «Вожык» распачаў выдаваць літаратурны дадатак — бібліятэчку з шасці выпускаў у год. Асобнымі кніжкамі выйшлі ў ёй творы Я. Коласа, К. Крапівы, П. Панчанкі, Я. Брыля, М. Лужаніна, Ул. Корбана, А. Зарыцкага, Ус. Краўчанкі, Э. Валасевіча, М. Пянкрата і інш. — усяго 25 кніжак. У 1961 г. падпісчыкі бібліятэчкі «Вожыка» атрымаюць кніжкі сатыры і гумару беларускіх пісьменнікаў П. Броўкі, І. Грамовіча, Н. Гілевіча і Л. Прокшы. Асобная кніжка выйдзе у 1961 г. «Кароткія народныя жарты» з ілюстрацыямі мастакоў.

Прапануем увазе чытачоў газеты «Літаратура і мастацтва» асобныя матэрыялы з чарговых шостага і сёмага нумароў «Вожыка».

П. КАВАЛЁЎ,
рэдактар часопіса.



— Стадыён пабудавалі, арку — таксама.
— Што б яшчэ прыдумаць?
— А можа, лазню пабудуем?

Малюнак Р. Грамыкі.

— Зноў п'яны прыйшоў? Не дапушчу да работы!
— Што вы! Я вам чвэртку прынёс...
— А, ну тады іншая справа.

Мал. С. Рманава.

— Каб я выпіваў столькі малака, дык быў бы з добрага быка.

Малюнак чытача С. Пілілчыка (г. Барысаў).

Не працуюць, а ядуць...

Шаптуны к любой навале
Тут жа рукі прыкладуць.
На вадзіцу пашапталі,
Сала, масла атрымалі, —
Не працуюць, а ядуць.

Спекулянты звычку маюць
Хоць на край зямлі махнуць.
Трантаў розных нахупляюць,
Прыязуць ды пазбываюць,—
Не працуюць, а ядуць.
— Божа, літасцівы будзь!

Кожны дзень у гэтых свята,
Рок-н-рол сабе таўкуць,
Бо у кожнага з іх тата
Мае добрую зарплату, —
Не працуюць, а ядуць.

Рабін, ксёндз і поп спяваюць:
— Божа, літасцівы будзь!
І тым часам не зяваюць,
Спрытна паству абдзіраюць, —
Не працуюць, а ядуць.

І прасвітары ў натхненні
Секты ў божы рай вядуць.
Сеюць шкоднае насенне,
Чысцяць брацці кішэні, —
Не працуюць, а ядуць.

У сямейцы дужа тонка
Справы ўласныя ідуць.
Самагонку гоніць жонка,
Ён збывае самагонку, —
Не працуюць, а ядуць.

Школу скончылі, а ў поле
Не жадаюць і зірнуць.
Даглядаць свіней? — Ніколі!
Хлеба ў бацькі ёсць даволі, —
Не працуюць, а ядуць.

Свой гарод сям'я капае,
У калгас жа не ідуць.
Зяць пасаду недзе мае,
Іх ніхто і не чапае, —
Не працуюць, а ядуць.

Установы часам штаты
Ухітраюцца раздуць.
Спяць работнікі заўзята
Ад зарплаты да зарплаты, —
Не працуюць, а ядуць.

Ул. КОРБАН.

Бусел: Тут мы яшчэ не адзін год дзетак гадаваць будзем.

Малюнак В. Ждана.

ЛІПА

БАЙКА

Бычка здалі на мясакамбінат.
Бычок заважыў цэнтнер з гакам.
А ў зводцы ж зроблена адзнака,
Што важыў ён паўтоны акурат.
У раёне зводку пакруцілі
У руках
І на сваю і рызыку, і страх —
Да тоны лічбу акруглілі...
«Вось гатак мы якраз уложымся у план
І будзем у пашане!
Ну, а пакуль той выяваць падман —
Дык утрасецца ўсё, на месца стане...»
А ў вобласці сядзеў таксама зух,
Для міністэрства рыхтаваў ён справаздачу
І зводкі ўсе на лад свой перайначыў:
Дзе тона значылася — дацягнуў да дзвюх,
Дзе дзве было—там тры паставіў.
Збалансаваў і па інстанцыі адправіў...
«Так будзе цот-у-цот — ажур!
Камар сам носу не падточыць.
Калі ж рэвізія наскочыць —
Апіска! Выбачайце! Цур!..»
...Чытаюць зводку й дзіву аж даюцца:
— Бычок і... столькі тон!?
Ды гэта ж бегемот! Ды гэта ж слон!
Так і да мамантаў, напэўна, дабяруцца...

* * *

Няма чаго здзіўляцца і гадаць:
Другому тыпу
Раз плюнуць — лічбу ў зводцы прыпісаць
І выдаць за сапраўднасць... ліпу!..

Эдуард ВАЛАСЕВІЧ

УСМЕШКІ ЧЫТАЧОЎ

СЛАБЫ ВУЗЕЛ

Сям'я з прыемнасцю слухала каля рэпрадуктара музыку. Раптам перадача абарвалася.

— Зноў у іх там з гэтым радыявузлом не ладзіцца... — незадоволена прабурчаў бацька.

— Мабыць, вузел слабы, што так часта развязваецца, — умяшалася ў гутарку маленькая Марыйка.

...І ВАДА НЕ ПАЦЯЧЭ

На кухні сапсаваўся кран. Пацякла вада. Бацька доўга корпаўся, але адрамантаваць кран яму не ўдалося. Ён выцер успацелы лоб і сказаў:

— Нічога не будзе, ўсё поўна цячэ.

— А ты дзядзьку Кірылу пакліч, няхай зманіць, — прапанаваў Рыгорка.

— Прычым тут дзядзька Кірыла?

— А ты ж сам казаў, што ён як зманіць, дык і вада не пацячэ.

Даслаў М. ЗАЛЕСКІ.

ДРЭННЫ ТАТА

Вова гуляў на двары ў футбол і разбіў сабе нос. Прыйшоў дадому. Плача. А бацька і кажа:

— Я так і ведаў, што гэта будзе!

Воўка — праз слёзы:

— Калі ты ведаў, дык чаму ж ты мне не сказаў?

Даслаў А. КАЖЭЦКІ.

СІЛА ЗВЫЧКІ

— Гануля, ці чула навіну?
— Якую?
— Айцец Захарый у выцяжэннік трапіў.
— Пабажыся.
— А я ж у бога не веру.
— Маніш!
— Далі-бог!

Л. КАЛОДЗЕЖНЫ.

Яўген КАРШУКОЎ

Сатырыкі

ГУМАРЭСКА

Дык вось, паўтараю яшчэ раз: заўтра каб сатырычная газета... Як яна ў нас называецца?

— «Аса»!

— Каб гэтая «Аса» вісела ў мяне раніцай на фабрычным двары. Зразумеў? Ды глядзі — пастарайся! Бо...

Старшыня фабрычнага камітэта Піліп Піліпавіч Пятрук прыжмурыўся і нерашуча паглядзеў на загадчыка клуба Макара Белкіна: ці варта яму гаварыць? Пасля махнуў рукою і даверліва заведаміў:

— Бо... заўтра да нас прыязджае прадстаўнік з міністэрства. А я чуў, што гэты таварыш—вялікі аматар сатыры! Сам, кажуць, як той Гогаль, байкі розныя папісвае. І асабліва задаволены, калі на прадпрыемстве добрую сатырычную газету ўбачыць... Хлебам яго не кармі, а сатыру гэту падавай! Зразумеў? Так што — дзейнічай, Макарушка... Не падвядзі!

І, даючы зразумець, што размова закончана, Піліп Піліпавіч важна схіліўся над нейкімі паперкамі.

Але Макар Белкін чамусьці не выходзіў. Нарэшце ён кашляну ў кулак і няўпэўненым голасам ціха спытаў:

— А-а... каго крытыкаваць, Піліп Піліпавіч?

— Як каго? — здзівіўся старшыня. — Абібокаў, п'яніц, парушальнікаў працоўнай дысцыпліны... Няўжо і гэта табе растлумачваць?

— Не, каго канкрэтна? Каб узгадніць...

— Зразумеў. Дарэчы, у цябе ёсць на прыкмеце хто-небудзь?

— Як жа, ёсць!

Макар Белкін пакорпаўся ў кішэні пінжака і выцягнуў лісток.

— Вось... начальніка цэха Мышкоўскага можна крытыкнуць. Працуюць у яго там дрэнна, без агеньчыку. Якраз кандыдатура ў сатырычную газету! Згодны?

Пятрук узняў угору вочы і, прыплюшчыўшы іх, задумаўся. Здавалася, ён так і заснуў з узнятай галавой, на якой зяяла вялікая лысіна.

— Не, не падыдзе,—задуменна сказаў ён.— Пакуль Мышкоўскага чапаць не будзем: няёмка, чаму—сам ведаеш. На вяселле ён нас запрасіў. Пятую дачку замуж аддае. Такая радасць у чалавека, а мы яму раптам... пілюлю горкую падсунем. На ўсё жыццё пакрыўдзім! Не, Макар, лепш іншага пашукаем.

— Ну, тады... тады майстра Кандыбу!

Макар нават паружавеў ад задавальнення.

— Згаджайцеся, Піліп Піліпавіч! Лепшай кандыдатуры і не прыдумаць. Кожны дзень п'яны ў цэх прыходзіць. Сорам! Рабочыя смяюцца. Мы ж яго так размалюем, што «Кракадзіл» пазайздросціць!

Пятрук насупіў бровы.

— Чакай. Кажаш, п'е? А я нешта не чуў...

— П'е, п'е! — горача пацвердзіў Макар.

— Гм, п'е. А хто не п'е? Вось ты... п'еш?

Хлопец збянтэжыўся.

— Зрэдку!

— Ну, вось бачыш! А Кандыба ў нас як-ніяк, а адказны работнік, на Дошцы гонару тры гады вісіць... Не-е, нельга аўтарытэту падрываць!

Хутка бедны рэдактар «Асы» выбіўся з сіл: усе яго кандыдатуры ў сатырычную газету былі адхілены па той ці іншай прычыне. Збіты з пантэлыку, ён замоўк, выціраючы потны лоб.

Але ратунак заўсёды прыходзіць нечакана. У гэты момант у дзверы пастукалі.

— Уваходзьце! — нездаволена крыкнуў Пятрук. — Заўсёды перашкаджаюць...

Дзверы рыпнулі, ледзь прыадчыніліся, і ў кабінет старшыні прасунулася ўскалмачаная рыжая барада дзеда Нічыпара, фабрычнага вартаўніка, потым і ўвесь ён — невысокі, у белым кароткім кажушку са стрэльбай за плячыма.

— Добрага здароўечка, Піліп Піліпавіч, — ласкава прамовіў ён. — Справа тут адна ў мяне...

Але Пятрук не слухаў... Ён раптам прыўзняўся, выцягнуўшы шыю, утаропіўся на вартаўніка. У тую ж хвіліну вочы яго весела бліснулі, ён выпрастаўся і таямніча падмігнуў Макару Белкіну. Пасля звярнуўся да старога:

— Падыдзі, стары...

Стары падышоў да стала і пачціва спыніўся.

— Значыць, па справе да мяне? А я таксама пагутарыць хачу з табою, — неяк вельмі ўжо ласкава загаварыў Пятрук. — Прызнайся, бацька: у ночы табе, таго, спаць хочацца на пасту? Праўда, хочацца?

— Ёсць такі грэх, Піліпавіч. Ды які ж чалавек не захоча спаць уночы? Жывёліна і тая спіць...

— Паспаць яно добра! — соладка пазяхнуўшы, з той жа сардэчнасцю працягваў старшыня. — Ну, ды бог з табою... Справа вось у чым: пакрытыкаваць цябе вырашылі ў нашай сатырычнай газеце.

— За што? Я ж прэмію нядаўна атрымаў!

— Ды ты не палохайся! Гэта не страшна: вось Макар цябе намалюе, нібы ты спіш на пасту — і ўсё. Сатыра, бацька, ахвяр патрабуе... Во-во! А за гэта... так і быць, прэмію ў наступным кварталі зноў выдзелім. Ну, як? Згодзен цяпер?

Вартаўнік хітра апусціў вочы, зняў шапку, пакруціў яе, раздумваючы для выгляду, і — згадзіўся.

— Бог з вамі, крытыкуйце, не прызвыкаць. Баба, лічы, мяне кожны дзень крытыкуе і — нічога. Сёмы дзесятак пярплю... Так што крытыкуйце, а я потым зайду...

І дзед Нічыпар, усміхаючыся ў пракураныя вусы, выйшаў...

Як толькі за вартаўніком зачыніліся дзверы, Пятрук самазадаволена, з гонарам прамовіў:

— Эх ты, Белкін! Бачыў, як з людзьмі размаўляць трэба. Скеміў, каго крытыкаваць? Чым не сатыра! Старыя, яны брат, заўсёды ў сатыры поспех маюць... Так што давай, Макарушка, дзейнічай: размалюй гэтага дзеда як мае быць! Ды каб Гогалем пахла!

Удача маладых

(«Дзяўчына з вяснушкамі» ў ТЮГу)

— Канфлікт можна вырашыць у рабочым парадку...

Так раіць адзін з персанажаў камедыі А. Успенскага «Дзяўчына з вяснушкамі». І ён мае рацыю. Ці варта было пісаць вялікую п'есу, узнімаць на яе пастаноўку цэлы тэатральны калектыў, заклікаць у глядзельную залу некалькі соцень чалавек, каб даказаць старому вопытнаму інжынеру, што будаваць дамы трэба не толькі хутка, але і якасна.

Тым не менш, Тэатр юнага гледача ўключыў гэтую п'есу ў свой рэпертуар і дням паказаў прэм'еру. Рэжысёра (заслужаны дзеяч мастацтва БССР Л. Мазалеўская) захапіла ў першую чаргу камсамольская прынцыповасць і крыштальнае сумленне перадавой моладзі. У спектаклі адчуваецца любоўная рука пастаноўшчыка, хоць пераадолець драматургічную нацяжку п'есы не зусім удалося.

Усё ж тэатр дамогся пэўнага поспеху. У першую чаргу яго трэба аднесці да вобразаў Глашы Івановай і Міхаіла Гусева.

Глаша — простая рабочая на будоўлі — галоўная гераіня спектакля. Яе пакахаў малады інжынер Аляксей Рошчын. Вось яна нясмела ўваходзіць у дом Аляксея, сарамліва знаёміцца з яго маці, увесь час бянтэжыцца, адчувае сябе сказанай і насцярожанай. Просценькая, няпытная дзяўчынка. Прынамсі, такое першае ўражанне ад Глашы, якую іграе артыстка Л. Барташэвіч.

Выканаўца не спяшаецца раскрываць адразу ўсе душэўныя якасці сваёй гераіні. Яна выяўляе іх паступова, рыса за рысай.

Найбольш цікавая першая палавіна спектакля, дзе ўся ўвага гледача сканцэнтравана на паводзінах Глашы — Барташэвіч. Падабаецца яе шчырасць, першыя пачуцці кахання да Алёшы, жыццёвая філасофія, узятая з выказванняў сяброўкі Мусі Агапкінай, заяўлічыя адносіны да інжынера Рубцова і тонкая жаночая дыпламатыя са сваёй будучай свякрухай. У гэтых сцэнах найбольш удала і пераканаўча артыстка раскрыла вобраз. Галоўныя якасці, якімі ўзбагаціла выканаўца сваю гераіню,—гэта незвычайная чысціня думак і паводзін Глашы.

Глыбейшаму раскрыццю характару Глашы ў значнай ступені садзейнічаюць яе партнёры — Аляксей і яго маці, якіх добра ўвасобілі артысты П. Дубашынскі і Ю. Фляйто. Гэтага, дарэчы, ніяк нельга сказаць пра артыста А. Якуціка — выканаўцу ролі інжынера Рубцова. Выканаўца не знайшоў такія псіхалагічныя сродкі, каб пераканаўча паказаць спрэчныя паводзіны і думкі свайго героя. Ён добрасумленна, але занадта проста-лінейна выкарыстоўвае матэрыял, які дае аўтар.

Таму з другой палавіны, калі Глаша ўступае ў адкрытую барацьбу з інжынерам Рубцовым, спектакль пачынае стамляць. Гэта ніколькі не сведчыць, што артыстка Барташэвіч вычарпала ўсе свае магчымасці і яе вобраз страціў цікавасць гледача. Наадварот, выканаўца праяўляе новыя якасці характару: непадкупную камсамольскую прынцыповасць і пераконанасць у справядлівасці. Артыстцы Л. Барташэвіч удаецца да канца ўдала пранесці вобраз праўдзівай, багатай унутраным жыццём нашай камсамольскай сучасніцы. З такімі людзьмі хочацца дружыць, браць з іх прыклад.

Люся Барташэвіч — нядаўняя выпускніца Мінскага тэатральна-мастацкага інстытута. Вобраз Глашы Івановай—першая бясспрэчная ўдача маладой артысткі.

Міша Гусеў займае ў спектаклі далёка не галоўнае месца. Уплятаецца ён у сямейныя адносіны Глашы дзесьці пад канец спектакля. Характарыстыка іншых дзеючых асоб, якія падрыхтоўваюць выхад Мішы, дае гледачу падставу ўбачыць парывістага, смелага і дзейснага юнака, для якога не існуе перашкод і цяжкасцей у любы момант жыцця. Аднак артыст В. Драбышэўскі, выканаўца гэтай ролі, перахітрыў чаканні глядзельнай залы. Ён катэгарычна адмовіўся ад таго партрэта, які дае яму Глаша, і прадстае перад усімі няўклюдным, нескладным хлопцам, які не ведае, куды дзець рукі. Такая дэталь дае магчымасць маладому артысту ярчэй адцяніць тыя дадатныя якасці, якія ён праявіць пазней.

Драбышэўскі — Міша і Барташэвіч — Глаша — выдатны сцэнічны ансамбль. Яны тонка разумеюць адзін аднаго, іх узаемаадносіны кранальныя і надзвычай чыстыя. Яны дапамагаюць адзін аднаму раскрыць усё багацце юначых душ. Артыст Драбышэўскі здолеў вынесці на сцэну цэлую біяграфію гераічнага пакалення сучасных камсамольцаў, якія мужна, у складаных абставінах узнімаюць цаліну, змагаюцца з тайгой, будуюць заводы.

Творчая ўдача гэтых маладых артыстаў не выпадковая. Яшчэ ў Тэатральна-мастацкім інстытуце іх выхоўвала Л. Мазалеўская — таленавіты і чулы педагог. Яе спектаклі—школа майстэрства не толькі для пачынаючых, але і для старэйшага пакалення артыстаў. Мы ўжо не раз былі сведкамі поспеху маладых выканаўцаў на сцэне Тэатра юнага гледача.

Сёння гэтая ўдача выпала на долю нядаўніх выпускнікоў. — Л. Барташэвіч і В. Драбышэўскага.

С. ПЯТРОВІЧ.



На здымку: сцэна са спектакля «Дзяўчына з вяснушкамі». У ролях: Глаша Іванова — **Л. Барташэвіч**, Міхаіл Гусеў — **В. Драбышэўскі.**

Пра дружбу і паэзію

Інтэрв'ю Пятра Глебкі для «Новай культуры»

У Польскай Народнай Рэспубліцы знаходзілася група савецкіх паэтаў у складзе Пятра Глебкі (кіраўнік дэлегацыі), Расула Гамзатава, Іяганеса Сэмпера, Уладзіміра Салаухіна і Уладзіміра Огнева.

Польскі літаратурна-грамадскі штотыднёвік «Нова культура» ў нумары за 26 сакавіка змясціў запіс гутаркі якая адбылася ў рэдакцыі часопіса з Пятром Глебкам і Уладзімірам Огневым. Аўтар запісу Збігнеў Жабіцкі адзначыў, што П. Глебка ў Польшчы часты госць. Ён «рэгулярна чытае польскія кнігі і літаратурныя выданні, зусім нядрэнна размаўляе па-польску». Часопіс знаёміць сваіх чытачоў з творчасцю беларускага паэта. Гаворыцца, што ён «у сваёй лірыцы стараецца захаваць цесную сувязь с традыцыямі; жыва цікавіцца народнай творчасцю, даследуе фальклор». Называюцца драматычныя творы паэта «Над ракой Бярозай» і «Святло з Усходу».

Удзельнікам сустрэчы было зададзена многа пытанняў. Які ваш погляд на паэтычнае наватарства? З якімі традыцыямі найбольш звязаны маладыя савецкія паэты? Як развіваецца маладая паэзія ў нацыянальных літаратурах Савецкага Саюза?— усё гэта цікавіла членаў рэдакцыйнага калектыву «Новай культуры». П. Глебка і У. Огнеў адказалі на гэтыя пытанні. Яны падкрэслілі, што для сучаснай савецкай паэзіі ў першую чаргу характэрна не фармальнае, а праблемнае наватарства. П. Глебка адзначыў, што «ў беларускай паэзіі адносна слаба праяўляецца тэндэнцыя да парушэння моўных норм. Гэта тлумачыцца тым, што ў беларускай літаратурнай мове гэтыя нормы яшчэ канчаткова не выкрышталізаваліся; таму паэты захоўваюць тут пэўны «кансерватызм», захоўваюць нормы, якія толькі фармуюцца, і не праводзяць з імі рызыкоўных эксперыментаў». У заключэнне Пятро Глебка сказаў, што вершы маладых польскіх паэтаў, такіх, як Граховяк ці Гарасымовіч, жыва абмяркоўваюцца ў беларускіх літаратурных колах. Пры гэтым З. Жабіцкі дадае, што Саюз пісьменнікаў БССР у кастрычніку гэтага года мяркуе правесці дыскусію аб сучаснай польскай паэзіі. Даклад зробіць, падкрэслівае часопіс, выдатны пісьменнік і выпрабаваны сябра Польшчы Максім Танк. Такое мерапрыемства «адыграе вялікую ролю ў культурным збліжэнні абодвух нашых народаў».

Ў тым жа нумары «Новэ культура» змясціла верш Пятра Глебкі «Смерць салдата» ў перакладзе на польскую мову Анджэя Тэнчынскага, а таксама фота ўдзельнікаў сустрэчы.

А. МАЛЬДЗІС.

Азірнёмся ў мінулае

Тэатр, якім ён быў

Тэатральныя коравы на мінскай сцэне ў далёкія часы (XIX стагоддзе) былі такія ж, як і ў большасці тэатраў многіх правінцый Расійскай імперыі.

Сярод акцёраў былі забяспечаны толькі карыфеі, а астатняя частка артыстаў Мінскага тэатра матэрыяльна залежала цалкам ад дырэктараў і антрэпрэнёраў. Вялікую ролю ў тэатральным жыцці тых год адыгрывалі памешчыкі-мецэнаты. Яны фінансавалі многія пастаноўкі, уплывалі на выбар рэпертуару, рабілі каштоўныя падарункі артыстам. Была шырока развіта сістэма пратэжыравання. Гэтыя мецэнаты ўзначальвалі так званыя «тэатральныя партыі» прыхільнікаў тых ці іншых талентаў.

Многія акцёрскія сем'і жылі ў горадзе дзесяткі год, вялі патрыярхальны ўклад жыцця і выступалі на сцэне ад малога да вялікага.

Радніліся акцёры пераважна таксама паміж сабою. Шлюбы з іншымі былі рэдкасцю. Шлюб з чалавекам «вышэйшай грамадскасці» лічыўся немыслімым. І калі адна з артыстак Мінскага тэатра — Мікуцкая стала жонкай невялікага памешчыка, дык пра гэты выпадак доўга гаварылі ў горадзе, як пра падзею «непрыстойную».

Жыццё акцёра правінцыяльнага тэатра праходзіла ў чатырох сценах і бясконцых гастрольных паездках. Рыпучыя фурманкі і разбітыя паштовыя карэты змяняліся пыльнымі падмосткамі, дзе цьмянае святло сальных плошак, адсвечанае бляшанымі рэфлектарамі, ледзь асвятляла падраныя і выгаралыя тыповыя дэкарацыі, закупленыя дваранамі для аматарскіх спектакляў.

Не вызначаўся добраўпарадкаваннем і Мінскі тэатр на былой Саборнай плошчы ў доме купца Саламонава. У гэтым памяшканні апроч спектакляў даваліся балі і маскарады, наладжваліся аматарскія канцэрты.

Зала складалася з трох ярусаў. Два з іх займалі ложы, а апошні — галерэя і раёк. Партэр, які запаўняўся пераважна гарнізоннымі афіцэрамі, чыноўнікамі і купецтвам, складаўся з дзесяці радоў крэслаў. Асвятленне было слабое. Ліхтары на авансцэне і люстра са свечак не маглі разагнаць паўэмрок, які панаваў у ложах і на сцэне. І толькі іншы раз, у час паказу фантастычных меладрам і жывых карцін, усё асвятлялася бенгальскім агнём. Сама сцэна была неглыбокай, з нязначным прасцэніумам. Святло адкідала ад акцёраў на дэкарацыі доўгія цені. Фае не было. Не было буфета. Іх замянялі калідор і скрыпучая лесвіца. На ўсю даўжыню першага і па баках апошняга стаялі прадаўцы і прапаноўвалі гледачам яблыкі, слівы і іншыя ласункі.

Тэатр, нягледзячы на даволі багатую мэблю і распісны дэкаратыўны навес, быў вельмі брудны. Двор яго з'яўляўся ўзорам антысанітарыі. А ў зале, у час прадстаўленняў пад крэсламі бегалі пацукі, выклікаючы нярэдка перапалох сярод гледачоў. Сам уласнік тэатра неахвотна ішоў на выдаткі, звязаныя з рамонтам будынка, хоць з дзвюхтысячнай датацыі горада тэатру ён забіраў сабе ільвіную долю—1.200 рублёў.

Тэатральныя прадстаўленні таго часу былі не толькі дарагімі, але і стамляючымі. Спектаклі працягваліся пяць—шэсць гадзін і ў большасці складаліся з трох частак. Спачатку давалася якая-небудзь трагедыя, камедыя ці меладрама, потым, пасля антракту — вадэвіль, а за ім — дывертысмент, складзены з сольных танцаў і спеваў. Перад спектаклем і ў антрактах музыка іграла вясёлыя музычныя ўрыўкі. Калі перад пачаткам прадстаўлення падобны «канцэрт» зацягваўся, усе разумелі, што кагосьці чакаюць з «бацькоў горада».

Сама тэатральная тэхніка ў тыя гады ў Мінскім тэатры была даволі прымітыўнай: люк у падлозе сцэны, блок для палётаў пад каласнікамі, машына для грому — вось і ўсё. Адзінае, што дапамагала поспеху многіх спектакляў, гэта выдатна напісаныя дэкарацыі. Перспектыўнае пісьмо іх стваральніка, мастака І. Кураткевіча, славілася далёка за межамі губерні. Апроч таго, на сцэне ў пачатку 60-х гадоў фігуравалі тыповыя павільёны, выпісаныя з берлінскіх дэкаратыўных майстэрань.

Славіўся Мінскі тэатр і «накладкамі» на спектаклях.

Але не гэта было самай вялікай перашкодай у працы тэатра, а прадузятая думка наведвальнікаў — багатых чыноўнікаў і памешчыкаў, чые густы і волгукі аб пастаноўках фарміравалі тэатральны рэпертуар. Яны, напрыклад, байкатавалі прэм'еру «Вяселле Крачынскага» Сухава-Кабыліна. Тэатральны рэцэнзент «Мінскіх губернскіх ведамасцей», апісваючы гэтую падзею, з'едліва і бязлітасна крытыкаваў «наведвальнікаў лож», іх нізкія запатрабаванні і інтарэсы.

«Меў выпадак не раз чуць скаргі публікі, што ў нас на рускай мове не даюць нічога сур'ёзнага, капітальнага, а толькі адны пустыя вадэвільчыкі. Мы меркавалі, што на такую выдатную п'есу ложы могуць быць разабраны загадзя; але нас здзівіла, што ложы ніхто і не пытаўся, тады як на якую-небудзь пяціактовую меладраму мінулага стагоддзя ў дзесяці карцінах з бенгальскім агнём ложы часам разбіраюцца за некалькі дзён наперад. Гэта нічога — падумалі мы, тэатр будзе напэўна поўны. Але дарэмна! Чаканні нашы не здзейсніліся: тэатр быў амаль пусты і п'еса, зусім сучасная, прынятая пецярбургскай публікай з захапленнем, і якую там давалі некалькі разоў запар, на нашай сцэне прынята холадна... Публіка ў крэслах драмала, а між тым на якім-небудзь пошлым вадэвільчыку з двухсэнсоўнасцямі і фарсамі сцены дрыжаць ад крыку і воплескаў!»

Пры паўторнай пастаноўцы гэтай камедыі тэатр запоўніла публіка больш дэмакратычная. Ложы мясцовай арыстакратыі ўнізе пуставалі, а ўвесь верхні ярус быў забіты гледачамі, якія вельмі непасрэдна перажывалі падзеі на сцэне: шчыра захапляліся і абураліся. «Нельга не бачыць суцяшальнага факту, — пісаў з гэтага поваду той жа рэцэнзент, — што частка нашай публікі (у чым мы і не сумняваліся ніколі) мае правільны і сучасны погляд на творы айчыннай сцэнічнай літаратуры наогул і на тэатральныя пастаноўкі ў асаблівасці».

Для характарыстыкі розных слаёў мінскай публікі і яе адносін да тэатральнага мастацтва, хочацца прывесці яшчэ адзін урывак, які паказвае, у якіх умовах даводзілася нярэдка іграць акцёрам.

«У публікі нашай, — пісаў адзін з сучаснікаў, — апроч таго, ёсць ахвота і самой пашумець у тэатры, але пашумець неразумна, недалікатна! Яшчэ нядаўна адзін аўдытар міжволі звярнуў на сябе ўвагу бесцырымоннасцю сваіх паводзін. Размаўляючы вельмі гучна са сваімі таварышамі і тым перашкаджаючы слухаць п'есу, ён адпускаў на ўвесь голас такія пошлыя, непрыстойныя слоўцы наконт акцёраў, актрыс і самой публікі, што многія, хто блізка сядзеў, вымушаны былі адварочвацца і раней часу пакідаць тэатр».

Напярэдадні рэвалюцыйных падзей 1863 г. памяшканне Мінскага тэатра было таксама месцам дэманстрацый франдзіруючай шляхты. Мясцовыя ўлады былі напалоханы. На заметку бралася ўсё, што хоць нечым сведчыла пра непавагу да царскага ўрада. Нават такі факт, калі на канцэрце Сеймура Шыфа дзве польскія памешчыцы — Свентаржэцкая і Лашч — у час выканання гімна «Боже царя храни» засталіся сядзець у крэслах, калі ўся публіка стаяла, паслужыў падставаю для сакрэтнага рапарту жандарскага штаб-афіцэра Рэйхарта шэфу жандараў князю Даўгарукаму.

Тэатральнае памяшканне ў доме Саламонава пасля 1864 г. выкарыстоўвалася толькі для канцэртаў. Такое становішча захоўвалася да сярэдзіны 70-х гадоў. У далейшым тэатр зноў пераехаў у гэтае памяшканне з Дваранскага сабрання. Тэатральную залу і сцэну зноў адрамантавалі: замянілі старыя кулісы, заслоны, але ў час пажару ў чэрвені 1884 г. згарэлі і само памяшканне і ўся тэатральная маёмасць. У адноўленым будынку ў 1885 г. зрабілі ваенны клуб, але прадстаўленне спектакляў у ім спынілася назаўсёды.

Г. БАРЫШАЎ.

Падзеі, факты, навіны

НА СТУДЫІ «МАСФІЛЬМ»

Патыліха... Так у Маскве яшчэ з даўніх часоў называецца прыгарадная Слабада, што на паўднёва-ўсходняй ускраіне, за Масквой-ракой, каля Ленінскіх гор. У наш час Патыліха слаўная тым, што тут знаходзіцца буйнейшая ў СССР кінастудыя «Масфільм». Якія фільмы будуць створаны тут?—такое пытанне цікавіць гледачоў.

Наш карэспандэнт наведаў студыю. Яму паведамілі:

— У 1961 годзе працягваецца работа над фільмамі, вытворчасць якіх пачата раней. Гэта перш за ўсё фільмы пра Уладзіміра Ільіча Леніна — «Пачатак веку» і «Ленін у Польшчы».

Аўтар сцэнарыя «Пачатак веку» С. Ермалінскі расказаў, што дзея фільма будзе адбывацца ў сяле Шушанскім, у Пецярбургу, Жэневе і Мюнхене.

Ставіць фільм рэжысёр А. Рыбакоў, здымаюць аператары В. Лістападаў, Ю. Схіртладзе. Нялёгка было знайсці выканаўцу на галоўную ролю 28-гадовага Ул. І. Леніна. Пасля працяглых рэпетыцый і выпрабаванняў на ролю Ільіча быў зацверджан артыст Саратаўскага тэатра імя Карла Маркса Ю. Каюраў. На ролю Н. К. Крупскай запрошана выпускніца школы-студыі МХАТа Е. Сітко.

«Ленін у Польшчы»—так будзе называцца новы фільм сумеснай савецка-польскай вытворчасці.

Кінарэжысёр Р. Чухрай працуе над карцінай па сцэнарыю Д. Храбравіцкага «Чыстае неба»—пра савецкую моладзь 40-х гадоў, пра подзвіг гэтага пакалення ў Вялікай Айчыннай вайне і ў пасляваенныя гады. Матэрыял фільма вельмі блізкі Рыгору Чухраю. Ён сам са школьнай парты прыняў удзел у баях за Савецкую Радзіму. Пачаўшы сваё ваеннае жыццё салдатам і закончыўшы камандзірам асобага паветранага дэсанта, Чухрай прайшоў у баях ад Сталінграда да Вены.

Запушчаны ў вытворчасць сцэнарый А. Каплера «Камсамольская брыгада». Пастаноўку ажыццяўляе Сяргей Юткевіч. Героі фільма — юнакі і дзяўчаты, маладзёжная брыгада аднаго з буйнейшых машынабудаўнічых заводаў Масквы.

У гэтым годзе будзе здымацца кінафільм «Кубанцы» (сцэнарыст В. Логінаў, рэжысёр-пастаноўшчык Іван Пыр'еў) — пра жыццё аднаго з калгасаў на Кубані. Гледачы ўбачаць, як жыве і працуе сакратар партыйнай арганізацыі калгаса, які заслужана карыстаецца аўтарытэтам сярод калгаснікаў.

Рыхтуецца да пастаноўкі мастацкі кінатэатр «Акадэмік з Асканіі» (аўтар — В. Казанская, рэжысёр - пастаноўшчык В. Герасімаў). Фільм прысвячаецца выдатнаму савецкаму вучонаму-заатэхніку Міхаілу Фёдаравічу Іванову, вядомаму не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі.

У вытворчасці фільм «Дачка Расіі» (аўтары П. Чараднічэнка і В. Салаўёў, рэжысёр С. Самсонаў) — экранізацыя гістарычнай аповесці П. Чараднічэнкі.

Запускаецца ў вытворчасць фільм па сцэнарыю Д. Храбравіцкага і М. Рома «У імя шчасця». Героі яго—савецкія вучоныя, якія працуюць у нашы дні ў галіне мірнага выкарыстання дасягненняў ядзернай фізікі.

Выдатны рускі пісьменнік Леанід Ляонаў перадаў у сцэнарны аддзел студыі свой новы сцэнарый «Уцёкі містэра Мак-Кінлі»—палітычны памфлет, які выкрывае марнасць спроб сярэдняга амерыканца застацца ў баку ад барацьбы супраць ваеннай пагрозы і атамчай небяспекі.

Здымаецца новы фільм па аповесці Ю. Бондарава «Апошнія залпы» (рэжысёр І. Парамонаў, аператар Н. Аланоўскі).

Працягваецца работа над фільмам «Дзяўчаты». Аўтар сцэнарыя Б. Бедны, рэжысёр Ю. Чулюк. Дзеянне адбываецца ў нашы дні ў адным з паўночных лесапрамгасаў. Героі—маладыя людзі. Мы ўбачым іх на рабоце, у вячэрняй школе, у клубе, у інтэрнаце.

Будзе створана па «Масфільме» некалькі экранізацый. Другая серыя «Уваскрэсення» па раману Л. Талстога, аперэта «Вольны вецер», балет «Шчаўкунчык», пастаноўка якога будзе ажыццёўлена разам з кінематаграфістамі Англіі, «Мой сябар, Колька» па аповесці А. Хмеліка, «Бітва ў дарозе» па раману Г. Нікалаевай, «Левы марш» на аснове жыцця і творчасці Ул. Маякоўскага, «Стэп» па аповесці А. П. Чэхава і інш.

У першай палове 1961 г. завершацца здымкі фільма «Да волі і святла» (пастаноўшчык А. Зархі). Гэта будзе дакументальна-мастацкі фільм пра барацьбу прыгнечаных народаў за свабоду і незалежнасць сваіх краін, за поўнае знішчэнне ганебнай каланіяльнай сістэмы.

У МУЗЕІ СЛАВЫ

Сёлета спаўняецца 20 год з часу мужнай абароны Брэсцкай цытадэлі. Няма дня, каб сюды, у крэпасць на Заходнім Бугу, не прыходзілі экскурсанты. Сотні тысяч чалавек пабывалі ў музеі крэпасці, дзе захоўваюцца свяшчэнныя рэліквіі.

Да 20-годдзя слаўнай абароны музей Брэсцкай крэпасці папаўняецца новымі экспанатамі. Акадэмія навук БССР сумесна з музеем Брэсцкай крэпасці выпускае зборнік успамінаў удзельнікаў незабыўнай абароны. Рыхтуецца новы дакументальны фільм аб Брэсцкай крэпасці, яе людзях, іх бяспрыкладнай адвазе.

Імя Паўлюка Труса

Лепшы будынак у гарадскім пасёлку Узда (Мінская вобласць) адведзен пад раённую бібліятэку імя Паўлюка Труса.

Заходзім у чытальную залу. На самым відавоку маляўнічая вітрына «Нашы землякі», а ў суседнім пакоі кніжная паліца з надпісам «Чытайце кнігі сваіх землякоў». Адзінаццаць пісьменнікаў дала беларускай савецкай літаратуры Уздзеншчына. Імя Паўлюка Труса, які некаторы час жыў у гэтым жа пасёлку, акружана тут асаблівай павагай і любоўю. Сястра паэта падарыла бібліятэцы кнігу вершаў П. Труса з яго аўтографам. Захоўваюцца тут і іншыя выданні твораў таленавітага паэта.

Работнікі бібліятэкі вырашылі запісаць падрабязныя ўспаміны людзей, якія ведалі П. Труса.

Кандрат Крапіва, Ілья Гурскі, Алесь Якімовіч, якія неаднаразова бывалі ў сваіх землякоў, падарылі бібліятэцы кнігі са сваімі аўтографамі. Галіна Вігурская і Юрый Назарэнка прыслалі з Кіева пераклады твораў К. Крапівы на ўкраінскую мову.

Цяпер на паліцах бібліятэкі—17 тысяч тамоў. Імі карыстаецца 670 чытачоў.

Бібліятэка імя П. Труса праводзіць канферэнцыі чытачоў. Цяпер рыхтуецца канферэнцыя па творах Івана Шамякіна.

ВЫ ЗГУБІЛІ РЭЧ...

У «Стол знаходак» трамвайна-тралейбуснага ўпраўлення Мінска прыйшла грамадзянка Г. Сакаловіч. З усхваляванага расказа старшаму дыспетчару А. Сяргеевай стала вядома, што дзяўчына спяшалася сустрэць на вакзале сваякоў і пакінула ў трамваі сумачку. У ёй былі грошы, дакументы і ключы ад кватэры.

— Не хвалюйцеся, — сказала А. Сяргеева,—сумачку вашу пастараемся знайсці.

І сапраўды, у той жа дзень Г. Сакаловіч была вернута прапажа. Сумачку, грошы і дакументы даставіла ў стол знаходак кандуктар трамвая А. Пуўлінава.

Якія толькі рэчы не прыносяць у «Стол знаходак»! Гадзінкі, грошы, парасоны, сняданні з гарачым кофе ў тэрмасах, галошы, чамаданы, галаўныя ўборы і інш.

— Бываюць і такія кур'ёзныя выпадкі,—успамінае А. Сяргеева.— Хатняя гаспадыня Т. Драбышэўская купіла мужу ў падарунак туфлі і пакінула іх у тралейбусе. Кандуктар К. Каханоўская знайшла пакупку, а на наступны дзень яна была ўручана ўласніку.

На здымку: рэчы ў «Стале знаходак» Мінскага трамвайна-тралейбуснага парку.

Тэкст і фота **К. Азіна.**

І красавіка ў акруговым Доме афіцэраў адбыўся канцэрт сімфанічнага аркестра Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Дырыжыраваў аркестрам Міхаіл Ангелаў (Балгарыя). Саліст—лаўрэат міжнародных конкурсаў Навум Штаркман.

На здымку: балгарскі дырыжор Міхаіл Ангелаў.

Лекцыі і канцэрты

У гастрольную паездку па гарадах Казахстана выехала канцэртная брыгада Беларускай дзяржаўнай філармоніі. У складзе брыгады канферансье Р. Дзідэнка, вакалісты І. Вішнеўская, заслужаны артыст Казахскай ССР Т. Ліхашорстаў, артысты балету А. Ваўчок і В. Царэвічанка, выканаўцы арыя і сцэн з аперэт Н. Калаптур і В. Пелях, піяністка Л. Галынская. Выступленні беларускіх артыстаў у Казахстане працягнуцца тры з паловай месяцы, за гэты час яны дадуць звыш ста канцэртаў.

* * *

Беларуская дзяржаўная філармонія наладзіла для студэнтаў Гомельскіх навучальных устаноў—педагагічнага інстытута і інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту лекцыі-канцэрты, прысвечаныя рускім кампазітарам—членам музычнага гуртка «Магутная кучка». Пра жыццё і творчасць М. Мусаргскага, А. Барадзіна, Ц. Кюі, М. Балакірава студэнтам расказаў музыказнаўца Л. Аўэрбах. Артысты філармоніі і операнага тэатра выканалі вакальныя і інструментальныя творы, урыўкі з опер.

* * *

У Саюзе пісьменнікаў БССР адбыўся вечар-канцэрт, у праграму якога былі ўключаны вакальныя творы беларускіх кампазітараў на словы беларускіх паэтаў. Харавыя творы, рамансы і песні Я. Цікоцкага, М. Аладава, А. Багатырова, Г. Вагнера, Ю. Семяныкі на словы М. Багдановіча, М. Танка, А. Русака, А. Бачылы, А. Вольскага выканалі хор Беларускага радыё пад кіраўніцтвам Г. Зеляковай і салісты М. Марозава і В. Прышчапёнак.

У абмеркаванні праслуханых твораў прынялі ўдзел музыказнаўцы В. Сізко, Я. Ракава, кампазітары, пісьменнікі і артысты.

Экспануюцца работы Л. Лейтмана

У клубе Саюза пісьменнікаў БССР экспануецца выстаўка малюнкаў мастака Л. Лейтмана, выкананых у акварэлі і гуашы. Амаль што ўсе яны прысвечаны сённяшняму дню рэспублікі. Тут — карціны аб будаўніцтве ў сталіцы, пейзажы, малюнкі з серыі «Гомсельмаш». Цікавыя работы «Летні дзень», «На ўскраіне Мінска», «Поўдзень», «Рака Арэса» і інш. Усяго на выстаўцы 45 малюнкаў.

Паведамленне

5 красавіка ў 17 гадзін у канцэртнай зале акруговага Дома афіцэраў адбудзецца пасяджэнне камісіі праўлення Саюза пісьменнікаў СССР сумесна з Саюзам пісьменнікаў Беларусі і пісьменнікамі Украіны, Масквы, Ленінграда, Смаленска і іншых гарадоў, прысвечанае пытанням развіцця мастацка-патрыятычнай літаратуры аб партызанскай барацьбе народаў Савецкага Саюза з фашысцкімі захопнікамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Прэзідыум Саюза пісьменнікаў БССР і Палітупраўленне БВА запрашаюць прыняць удзел у пасяджэнні ўсіх беларускіх пісьменнікаў, ветэранаў партызанскага руху ў Беларусі, работнікаў рэспубліканскага і мясцовага друку і выдавецтваў, а таксама пачынаючых аўтараў з літаратурных аб'яднанняў Мінскага гарнізона.

ПАПРАЎКА

У артыкуле Р. Кісялёва «Быць актыўнымі памочнікамі партыі», які надрукаваны ў нумары нашай газеты за 31 сакавіка г. г., у восьмым абзацы (другая калонка) трэці сказ трэба чытаць: «У Магілёўскай вобласці няма ніводнага раёна, які справіўся б з гэтай задачай».

Удзелнікам сустрэчы

Поспехам у юных гледачоў Мінска карыстаюцца выступленні дзіцячага драматычнага гуртка Палаца культуры прафсаюзаў. У рэпертуары гэтага гуртка — «Казка аб казках», «Гэта забыць нельга», «Два клёны». Рыхтуецца новы спектакль па п'есе «Сябра мой, Колька!».

На здымку: рэпетыцыя п'есы «Сябра мой, Колька!».

Фота С. Чырэшкіна.

На экране—фільмы Венгрыі

У сувязі з 16-й гадавінай з дня вызвалення Венгрыі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў многія гарадскія і сельскія кінаўстаноўкі Беларусі арганізавалі шырокі паказ венгерскіх кінафільмаў: «Саляны слуп», « У поўнач», «Домік пад скаламі», «Кантрабандысты», «Анна Эйдэш», «Трыццаць дзевятая брыгада», «Граніца ў некалькіх кроках», «Бяссонныя гады», «Падшывалец», «Катастрофа» і інш.

Асаблівым поспехам карыстаюцца фільмы «Учора» і «Світае», прысвечаныя цяжкім дням барацьбы перадавых людзей Венгрыі супраць контрэвалюцыйнага мецяжу 1956 г.

У гэтыя дні на экранах рэспублікі пачала дэманстравацца новая мастацкая кінаапавесць пра жыццё сучаснай моладзі «Акно ў небе», створаная рэжысёрам Іожэфам Кішам на кінастудыі «Будапешт» па матывах аднайменнага рамана Міклаша Герэнчара.

З цікавасцю праглядзяць беларускія гледачы венгерскія хранікальна-дакументальныя і навукова-папулярныя кінакарціны.

У фае многіх кінатэатраў арганізаваны фотавыстаўкі пра поспехі сацыялістычнага будаўніцтва ў Венгерскай Народнай Рэспубліцы.

Н. КУЗЬМІЦКАЯ.

Кожны вечар у клубе людна

У клубе вёскі Пагост перад сеансамі звычайна выступаюць спецыялісты сельскай гаспадаркі — галоўны аграном саўгаса т. Слабко, заатэхнік т. Штайда, ветэрынарны ўрач т. Мельнікаў, настаўнікі мясцовай школы. Яны праводзяць гутаркі, даклады, адказваюць на шматлікія пытанні моладзі. Затым кінамеханік Міхась Горбач з матарыстам Уладзімірам Гардашэўскім паказваюць фільм.

У зале поўна людзей. Пасля сеанса ў клубе наладжваюцца гульні, у бібліятэцы — чыткі газет, кніг.

Дэманстрацыя фільмаў праводзіцца ў клубе ў спалучэнні з іншымі культурна-масавымі мерапрыемствамі. У клуб ідуць і калгаснікі нават з аддаленых вёсак, бо яны спадзяюцца, што цікава і весела правядуць вольны час.

Кінамеханік Міхась Горбач і матарыст Уладзімір Гардашэўскі змагаюцца за званне ўдарнікаў камуністычнай працы. У гонар XXII з'езду КПСС яны абавязаліся выканаць гадавы план да 15 кастрычніка.

А. ПЕНКРАТ,
намеснік загадчыка Бярэзінскага раённага аддзела культуры.

Да Усесаюзнай мастацкай выстаўкі

Днямі адбыўся сход мастакоў Мінска, на якім з дакладам «Аб задачах мастакоў Беларусі ў перыяд падрыхтоўкі да Усесаюзнай мастацкай выстаўкі 1961 года» выступіў П. Нікіфараў.

— Выстаўка сёлета, — сказаў П. Нікіфараў, — некалькі адрозніваецца сваім арганізацыйна-тэхнічным бокам. Кожнай рэспубліцы адводзяцца залы ў манежы. Беларусі адведзена дзве залы.

Сход прыняў рашэнне стварыць выставачную камісію.

Музычная серада

Цікава прайшла чарговая музычная серада ў Саюзе кампазітараў БССР. Кампазітары, паэты, музыказнаўцы, артысты, выкладчыкі музыкі сярэдніх школ Мінскага раёна праслухалі новыя песні Л. Абеліёвіча, з якіх яркае ўражанне пакінулі «Песня млынара» і «Мінскія сосны» (саліст Д. Зубрыч), квінтэт П. Падкавырава для драўляных духавых інструментаў, харавыя творы В. Маціна (выканаўца—хор Беларускага радыё).

Адбылося абмеркаванне новых твораў.

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

АТ 00150

Друкарня імя Сталіна.